Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Пятніца, 22 красавіка 1938 г. № 22 (364)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ДА НОВЫХ ТВОРЧЫХ ВЫШЫНЬ

Шэсць год таму назад, па ініцыятыве таварыша Сталіна, Цэнтральны Камітэт комуністычнай партыі вынес рашэнне аб стварэнні адзінага Саюза совецкіх пісьменнікаў.

Цэнтральны Камітэт комуністычнай партыі ў сваёй пастанове запісаў: «Аб'яднаць усіх пісьменнікаў, якія падтрымліваюць платформу совецкай улады і імкнуцца ўдзельнічаць у соцыялістычным будаўніцтве, у адзіны Саюз совецкіх пісьменнікаў з комуністычнай фракцыяй у ім».

Гэта рашэнне, адкрыўшае новую старонку ў гісторыі чалавечай культуры, нанесла рашаючы ўдар усім і ўсялякім спробам трацкісцкіх мярзаўцаў з РАПП'а адарваць літаратуру ад вялікай справы будаўніцтва соцыялізма, звесці яе на шляхі буржуазнага эстэцтва і дэкадэнцтва. Подлыя ворагі народа, іезуіты слова тыпу Авербаха і Варонскага спрабавалі адарваць баявы атрад совецкіх літаратараў ад партыйнага кіраўніцтва. Яны культывіравалі групаўшчыну, сеялі паміж пісьменнікамі разлад і рознь, праслаўлялі бяздарную пісаніну агентаў фашысцкіх разведак — кіршонаў, есенскіх і да іх падобных, яны сістэматычна, подлымі, каварнымі метадамі цкавалі лепшых прадстаўнікоў совецкай літаратуры, якія сваімі творамі пракладі шлях да сэрцаў працоўных мас. У нянавісці да нашай вялікай соцыялістычнай радзімы яны аднялі ад народа песняра яго думак і спадзяванняў, таленавіцейшага паэта совецкай эпохі Владзіміра Маякоўскага. Яны таілі звярыную нянавісць да родапачынальніка пролетарскай літаратуры, найвялікшага гуманіста, агністага барацьбіта за комунізм Аляксея Максімавіча Горкага. Два гады назад яны ажыццявілі свой зладзейскі замысел: вялікі Горкі паў афярай ад рукі подлых бандытаў з права-трацкісцкага блока.

Ідэйна-палітычнае адзінства совецкіх пісьменнікаў, іх згуртаванне вакол партыі і совецкага ўрада, іх адданасць народу і соцыялістычнай радзіме знайшлі сваё яркае адлюстраванне на першым Усесаюзным з'ездзе совецкіх пісьменнікаў. Гэтай дэманстрацыі ўрачыстасці нашай шматнацыянальнай соцыялістычнай літаратуры не перашкодзілі і не маглі перашкодзіць вылазкі подлых ворагаў народа, аблезлых фашысцкіх псоў Бухарына і Радэка.

Першы Усесаюзны з'езд совецкіх пісьменнікаў яшчэ шчыльней згуртаваў совецкіх пісьменнікаў вакол партыі і яе ленінска-сталінскага ЦК. У прамовах вялікага пролетарскага пісьменніка А. М. Горкага, у прамовах мужнага сталінца А. А. Жданава былі начэртаны шляхі развіцця совецкай літаратуры.

«Наша літаратура з'яўляецца самай маладой з усіх літаратур усіх народаў і краін. Разам з тым яна **з'яўляецца самай ідэйнай, самай перадавой і самай рэволюцыйнай літаратурай».**

Гэтыя словы тав. Жданава, сказаныя ім на першым Усесаюзным з'ездзе совецкіх пісьменнікаў, усялялі пачуццё ўпэўненасці і бадзёрасці, пачуццё гордасці ў сэрцы совецкіх пісьменнікаў, якія выйшлі з першага свайго з'езда адзінай сям'ёй.

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі расла і мацнела совецкая літаратура. Такія творы, як «Жыццё Кліма Самгіна», «Егор Булычоў і іншыя» — Горкага, «Пётр Першы», «Хлеб» — Аляксея Талстога, раманы Шолахава, «Апошні з Удэге» — Фадзеева, «Цусіма» — Новікава-Прыбоя, «На Усходзе» — Паўленкі, «Я сын працоўнага народа» — Катаева, «Адзіноцтва» — Вірта, прасякнутыя пачуццём высокага патрыятызма песні Сулеймана Стальскага, Джамбула і дзесяткі выдатных тварэнняў совецкай эпохі, — заслужылі любоў шырокай масы совецкага чытача, уваходзяць у залаты фонд соцыялістычнай культуры.

У шчыльным яднанні з літаратурамі братніх рэспублік квітнее беларуская совецкая літаратура.

У бліжэйшы час адкрываецца чарговы пленум Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

Беларуская літаратура мае нямала дасягненняў, нямала твораў, якія лічацца ў актыве ўсесаюзнай літаратуры. Сярод іх зборнікі вершаў і паэм Янкі Купалы, Якуба Коласа, аповесць «Дрыгва» Якуба Коласа, вершы і паэмы паэтаў П. Броўкі, П. Глебкі, Г. Каменецкага, З. Аксельрода, апавяданні, аповесці і раманы З. Бядулі. М. Лынькова, К. Чорнага, біяграфічныя аповесці яўрэйскага пісьменніка Фінкеля, зборнік вершаў і паэм «Сталін у беларускай совецкай паэзіі», «Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну», «Дванаццаць песень аб Чырвонай Арміі», зборнік «Ленін і Сталін у беларускай народнай творчасці», зборнік «Беларускія народныя і рэволюцыйныя песні».

Беларускія тэатры ў бягучым годзе ставяць арыгінальныя п'есы: «У пушчах Палесся» — Я. Коласа, «Партызаны» — К. Крапівы, драму з гісторыі беларускага народа «Кацярына Жарнасек» — М. Клімковіча.

Вялікім дасягненнем для беларускага мастацтва з'яўляецца факт пастаноўкі нашымі тэатрамі п'ес Горкага і Остроўскага.

Дзяржаўны беларускі тэатр оперы і балета, побач з пастаноўкай оперы Дзержынскага «Ціхі Дон», ставіць дзве арыгінальныя оперы: «Міхась Падгорны» Е. Цікоцкага — лібрэта П. Броўкі і «Дрыгва» А. Багатырова — лібрэта Е. Рамановіча паводле аднайменнай аповесці Я. Коласа.

У бліжэйшы час на кніжныя паліцы паступяць раман Э. Самуйлёнка «Будучыня», у якім аўтар гаворыць аб дружбе народаў Совецкага Саюза, і паэма аб лёсе беларускай жанчыны «Кацярына» П. Броўкі.

Працуюць над новымі творамі і маладыя пісьменнікі: А. Куляшоў, М. Паслядовіч, Э. Агняцвет, Ул. Кандраценя і інш.

У гэтым годзе будуць выданы аднатомнікі перакладаў Пушкіна, Шэўчэнкі. Будзе выдана таксама на беларускай мове паэма Шота Руставелі «Віцязь у тыгравай скуры».

Усё гэта сведчыць аб тым, што беларуская совецкая літаратура крочыць у першых радах усесаюзнай літаратуры, дзень за днём заваёўваючы ўсё новыя і новыя творчыя вышыні.

Але было-б буйнейшай памылкай за гэтымі поспехамі не заўважаць і тых значных недахопаў, якія маюць месца на фронце беларускай совецкай літаратуры.

Адзначым, што ў беларускай совецкай літаратуры па гэты дзень прэваліруе тэма мінулага, што побач з кнігамі аб мінулым, пераважна перыяду імперыялістычнай вайны, перыяду грамадзянскай вайны і белапольскай акупацыі, у беларускай совецкай літаратуры яшчэ мала кніг аб шчаслівым сёння нашай вялікай радзімы, аб новым чалавеку соцыялістычнай эпохі, аб сталінскай моладзі.

Адзначым, што беларускія пісьменнікі, якія так ахвотна працуюць над тэмай грамадзянскай вайны, да гэтага часу яшчэ не падыйшлі як след да тэм з жыцця нашай Чырвонай Арміі, да тэм выкрыцця дзеянняў і замыслаў міжнародных падпальшчыкаў вайны — фашыстаў.

Прычыны падобных недахопаў — у штодзённай рабоце Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, у рабоце яго праўлення, якое мала яшчэ робіць для таго, каб пашырыць творчы кругагляд пісьменніка, наблізіць пісьменніка да жывой крыніцы творчасці—жыцця.

Недастаткова яшчэ пастаўлена ў Саюзе пісьменнікаў масавая палітыка-выхаваўчая работа, не арганізавана яшчэ для пісьменніка планамерная, удумлівая, сістэматычная дапамога, формы і метады якой павінны выходзіць з яго творчых запросаў.

Хваля творчай актыўнасці, якая ўскалыхнула секцыі Саюза пісьменнікаў перад пленумам і ў сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у Вярхоўны Совет Беларускай ССР, сведчыць аб гатоўнасці пісьменніка адгукнуцца на кожную падзею, звязаную з жыццём нашай шчаслівай радзімы. І задача праўлення ССП БССР, задача партыйнай арганізацыі Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР даць накіроўваючы пачатак гэтай гатоўнасці.

Задача пленума—яшчэ больш мабілізаваць рэволюцыйную пільнасць беларускіх совецкіх пісьменнікаў на выкарчоўванне ў літаратурным асяроддзі вынікаў шкодніцтва, прычыненага ворагамі народа. Нельга ні на мінуту забываць, што вораг разгромлен, але канчаткова яшчэ не дабіт.

На пленуме будзе заслухан рад дакладаў аб новых творах беларускіх совецкіх пісьменнікаў. Пленум павінен падвесці вынікі творчым дасягненням беларускай совецкай літаратуры і арганізаваць пісьменнікаў на напісанне твораў, вартых нашай соцыялістычнай эпохі, твораў, у якіх была-б адлюстравана веліч гераічнай барацьбы совецкага народа, якую вядзе ён у імя ўрачыстасці комунізма.

Б. САСНОЎСКІ

ПЕСНЯ ПРА ВЫБАРЫ

Прыдзе дзень той чаканы да нас,
Прыдзе зноў к нам вялікае свята:
На участках усе ў гэты час
Пойдуць з песняй вясёлай, узнятай.
ПРЫПЕЎ:
Слава дочкам, сынам дарагім!
Усміхаюцца светлыя далі нам,
Як адзін галасы аддадзім
Выхаванцам вялікага Сталіна.
Сонца, зоры зазззяюць ярчэй,
Мы жыццё яшчэ больш упрыгожым,
Многа думак і светлых надзей
У свае бюлетэні ўложым.
(Прыпеў).

Тых, хто славай авеян людской,
Хто ішоў з намі ў першых калонах,
Над шчаслівай совецкай зямлёй,
Як сцягі, іх падымем імёны.
(Прыпеў).
Слаўся, ордэнаносны мой край,
Твае свята ўжо недалёка.
Песню звонкую гучна спявай,
Няхай песня ўзлятае высока.
ПРЫПЕЎ:
Слава дочкам, сынам дарагім!
Усміхаюцца светлыя далі нам,
Як адзін галасы аддадзім
Выхаванцам вялікага Сталіна.

Дэкада азербайджанскага мастацтва

Заключны канцэрт

У сапраўднае свята народнага азербайджанскага мастацтва выліўся заключны канцэрт дэкады, які адбыўся вечарам 15 красавіка ў Дзяржаўным ордэна Леніна Акадэмічным Вялікім тэатры СССР.

У канцэрце прынялі ўдзел калектывы Азербайджанскай дзяржаўнай філармоніі — хор, аркестры народных інструментаў, ансамбль народных танцаў; хор, аркестр і салісты тэатра імя М. Ф. Ахундава; ашугі, лепшыя прадстаўнікі самадзейнага мастацтва.

Урачыста і велічна прагучэла песня «Прывітанне Сталіну», музыка якой напісана народным артыстам АзССР Узеірам Гаджыбекавым на словы паэта Сулеймана Рустама.

На заключным канцэрце дэкады азербайджанскага мастацтва прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, Л. М. Кагановіч, К. Е. Варашылаў, М. І. Калінін, А. А. Андрэеў, В. Я. Чубар, А. І. Мікаян, С. В. Касіор, А. А. Жданаў, Г. М. Дзімітраў, М. Ф. Шкіратаў, М. Д. Багіраў.

Па сканчэнні канцэрта ўсе прысутныя гарачай авацыяй віталі ўдзельнікаў дэкады азербайджанскага мастацтва.

ВЫСОКАЯ ЎЗНАГАРОДА

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР за выдатныя поспехі ў справе развіцця азербайджанскага опернага мастацтва ўзнагароджан ордэнам **Леніна** Азербайджанскі дзяржаўны тэатр оперы і балета імя М. Ф. Ахундава.

Народнаму артысту АзССР Узеіру **Гаджыбекаву,** народнай артыстцы АзССР Шаўкет **Мамедавай,** заслужанаму артысту АзССР **Мамедаву,** Бюль Бюль, народнаму артысту РСФСР, АзССР і УзССР **Р. М. Гліэру** Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР прысвоена годнасць Народнага артыста СССР.

За выдатныя поспехі ў справе развіцця азербайджанскага опернага мастацтва, азербайджанскай музыкі, песні і танцаў указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР узнагароджаны: ордэнам **Леніна** — Гаджыбекаў Узеір — кампазітар, народны артыст АзССР; ордэнам **Працоўнага Чырвонага Сцягу** — Шаўкет Мамедава — народная артыстка АзССР, Ідаят-Задэ — галоўны рэжысер тэатра, заслужаны артыст АзССР, Сарабскі — народны артыст АзССР, Грыгар'ян-Мкртычан — салістка оперы і іншыя, усяго дзесяць чалавек.

Ордэнам **«Знак пачота»** узнагароджаны: Мамедаў, Бюль Бюль, — заслужаны артыст АзССР, Ашраф Гасанаў — дырыжор оперы, А. Іскандэраў — рэжысер оперы, А. Султанаў—мастак оперы, А. Мамедава — заслужаная артыстка АзССР, Р. М. Гліэр — народны артыст РСФСР, АзССР і УзССР і іншыя, усяго 40 чалавек.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР сям'і нябожчыка кампазітара Магомаева Муслума, аўтара оперы «Наргіз», выдаецца адначасовая дапамога ў памеры 20 тысяч рублёў.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанавіў: прыняць выдаткі на паездку і ўтрыманне калектываў Азербайджанскай оперы і Азербайджанскай філармоніі за кошт дзяржавы, прэміраваць удзельнікаў дэкады азербайджанскага мастацтва ў Маскве — работнікаў Азербайджанскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя М. Ф. Ахундава і Азербайджанскай дзяржаўнай філармоніі — грашовай прэміяй у памеры двухмесячнага аклада.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанавіў у мэтах стварэння найбольш спрыяючых умоў для далейшага развіцця тэатральнага мастацтва Азербайджанскай ССР: адпусціць на рэканструкцыю будынка Азербайджанскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя М. Ф. Ахундава 3 мільёны рублёў і закончыць рэканструкцыю ў 1939 годзе, зацвердзіць да пабудовы спецыяльна прыстасаваны жылы дом для артыстаў тэатра оперы і балета імя М. Ф. Ахундава коштам тры мільёны рублёў, з заканчэннем пабудовы дома ў 1939 годзе.

ЛОЗУНГІ ДА 1 МАЯ 1938 г.

1. Няхай жыве 1-е мая—баявы агляд рэволюцыйных сіл міжнароднага пролетарыята!

2. Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся! Станавіцеся пад інтэрнацыянальны сцяг Маркса—Энгельса—Леніна!

3. Братам па класу, вязням капітала, афярам крывавага фашысцкага тэрора, барацьбітам за перамогу рабочага класа ў дзень 1 мая наша пролетарскае прывітанне!

4. Фашызм—гэта тэрарыстычная палітыка капіталістаў і памешчыкаў супроць рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі. Фашызм — гэта захватніцкая вайна. Фашызм—злейшы вораг дружбы паміж народамі свету. Мабілізуем сілы на барацьбу з фашызмам!

5. Рабочыя, работніцы, сяляне і працоўныя ўсіх краін! Пашырайце і ўмацоўвайце народны фронт барацьбы супроць фашызма і вайны! За мір, за дэмакратычныя свабоды, за соцыялізм!

6. Барацьба іспанскага народа супроць унутранага і замежнага фашызма — агульная справа ўсяго перадавога і прагрэсіўнага чалавецтва. Прывітанне гераічнаму іспанскаму народу, які змагаецца за сваю незалежнасць і свабоду!

7. Брацкае прывітанне вялікаму кітайскаму народу, які змагаецца за сваю незалежнасць супроць японскіх і іншых захватчыкаў!

8. «Мы стаім за мір і адстайваем справу міру. Але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны» (Сталін).

9. Няхай жыве наша родная, непераможная Чырвоная Армія, магутны аплот мірнай працы народаў СССР, верны страж заваяванняў Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі!

10. Абарона бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР!

11. Баявое прывітанне маладым байцам Чырвонай Арміі, прысягаючым 1 мая на вернасць совецкай уладзе, на вернасць нашай вялікай соцыялістычнай радзіме!

12. Няхай жыве Ваенна-Марскі Флот СССР — надзейная ахова марскіх граніц нашай радзімы!

13. Няхай жывуць совецкія лётчыкі, гордыя сокалы нашай радзімы, якія дабіліся сусветных авіяцыйных рэкордаў!

14. Прывітанне байцам-пагранічнікам, зоркім часавым краіны соцыялізма!

15. Няхай растуць і мацнеюць, няхай авалодваюць тэхнікай і загартоўваюцца наша родная, магутная Чырвоная Армія, Ваенна-Марскі Флот і Чырвоная авіяцыя!

16. Узмоцнім і ўмацуем інтэрнацыянальныя сувязі рабочага класа СССР з рабочым класам капіталістычных краін! Вышэй сцяг міжнароднай пролетарскай салідарнасці!

17. Няхай жыве саюз рабочых і сялян— аснова совецкай улады!

18. Царская Расія была турмой народаў. У совецкай краіне расце і мацнее вялікі саюз роўнапраўных народаў. Няхай жыве брацкі саюз і вялікая дружба народаў СССР!

19. Няхай жыве маральнае і палітычнае адзінства совецкага народа, заваяваўшага свабоду і незалежнасць нашай радзімы пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі!

20. Сталінская Канстытуцыя — вынік барацьбы і перамог Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Няхай жыве Канстытуцыя перамогшага соцыялізма і сапраўднага дэмакратызма!

21. Ліквідуем поўнасцю ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі вынікі шкодніцтва права-трацкісцкіх наймітаў замежных разведак!Ператворым СССР у непрыступную крэпасць соцыялізма!

22. Многамільённай арміі ўдарнікаў і ўдарніц прамысловасці і транспарта, стаханаўцам і стаханаўкам, — знатным людзям нашай краіны — большэвіцкае прывітанне!

23. Даб'емся выканання і перавыканання гаспадарчага плана 1938 года—першага года трэцяй пяцігодкі! Разгорнем шырэй магутны стаханаўскі рух!

24. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі цяжкай індустрыі і машынабудаўніцтва! За высокую здабычу вугалю, нафты, метала, за своечасовы выпуск лепшых машын, якія з'яўляюцца асновай развіцця народнай гаспадаркі краіны!

25. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі абароннай прамысловасці! Мацуйце абаронную магутнасць нашай радзімы! Узбройвайце родную Чырвоную Армію навейшай тэхнікай!

26. Рабочыя і работніцы, камандзіры і інжынеры лёгкай прамысловасці! Больш паркалю, шоўку, сукна, трыкатажа, абутку грамадзянам совецкай краіны! Змагайцеся за паляпшэнне якасці прадукцыі!

27. Прывітанне стаханаўцам соцыялістычных палёў, па-большэвіцку выконваючым план веснавой сяўбы!

28. Калгаснікі і калгасніцы, аграномы і работнікі соўгасаў! Змагайцеся за ўзорнае завяршэнне веснавой сяўбы і высокі ўраджай! Няхай жыве заможнае і культурнае жыццё калгасаў і калгаснікаў!

29. Узнімем культурна-тэхнічны ўзровень рабочага класа да ўзроўню работнікаў інжынерна-тэхнічнай працы!

30. Палкае прывітанне героям-папанінцам, адважным заваявальнікам Паўночнага полюса, дастойным сынам соцыялістычнай радзімы!

31. За далейшы росквіт культуры народаў СССР, за новыя поспехі і заваяванні совецкай навукі, тэхнікі і мастацтва!

32. Няхай жыве роўнапраўная жанчына СССР, актыўная ўдзельніца ў кіраванні дзяржавай, гаспадарчымі і культурнымі справамі краіны!

33. Піонеры і піонеркі! Навучаючыяся совецкай школы! Авалодвайце ведамі, вучыцеся стаць барацьбітамі за справу Леніна—Сталіна!

34. Слаўным фізкультурнікам і фізкультурніцам совецкай краіны—першамайскае прывітанне!

35. Няхай жыве комсамол — магутны рэзерв і надзейны памочнік большэвіцкай партыі! Няхай жыве працоўная моладзь нашай радзімы!

36. Шырэй разгорнем крытыку і самакрытыку нашых недахопаў! Умацуем магутнасць соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян!

37. «Сувязь з масамі, умацаванне гэтай сувязі, гатоўнасць прыслухоўвацца да голасу масы, — вось у чым сіла і неперамажнасць большэвіцкага кіраўніцтва» (Сталін).

38. Узмоцнім рэволюцыйную пільнасць! Пакончым з палітычнай бесклапотнасцю ў нашым асяроддзі!

39. Выкаранім ворагаў народа—трацкісцка-бухарынскіх і буржуазна-нацыяналістычных шпіёнаў і шкоднікаў, наймітаў замежных разведак! Смерць здраднікам радзімы!

40. Выкрыем усіх і ўсякіх двурушнікаў!Ператворым нашу партыю ў непрыступную крэпасць большэвізма!

41. Рабочыя і сяляне! Разгортвайце выбарчую кампанію! Вылучайце сумесна ў Вярхоўныя Советы Саюзных і Аўтаномных Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік лепшых людзей, адданых да канца справе Леніна—Сталіна!

42. Працоўныя СССР! Выбірайце ў Вярхоўныя Советы Саюзных і Аўтаномных Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік доблесных патрыётаў нашай радзімы, непахісных барацьбітоў за шчасце рабочых і сялян, за соцыялізм!

43. Комуністы! Мацней сувязь з беспартыйнымі масамі. Галоўнае ў выбарчай кампаніі— не адмяжоўвацца ад беспартыйных, а дзейнічаць разам з беспартыйнымі і сумесна з імі вылучаць кандыдатаў у Вярхоўныя Советы Саюзных і Аўтаномных Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

44. Няхай жыве блок комуністаў і беспартыйных у надыходзячых выбарах Вярхоўных Советаў Саюзных і Аўтаномных Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

45. Няхай жыве і мацнее наша магутная радзіма — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

46. Няхай жыве Ўсесаюзная Комуністычная партыя большэвікоў — перадавы атрад працоўных СССР!

47. Няхай жыве Комуністычны Інтэрнацыянал—кіраўнік і арганізатар барацьбы супроць вайны, фашызма і капіталізма! Няхай жыве комунізм!

48. Няхай жыве вялікі, неперамажны сцяг Маркса — Энгельса — Леніна! Няхай жыве ленінізм!

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў)



Народныя артысты СССР (злева направа): Узеір Гаджыбекаў, Шаўкет Мамедава, Р. М. Гліэр, Бюль-Бюль (Мамедаў).

ДЭКАДА АЗЕРБАЙДЖАНСКАГА МАСТАЦТВА

ПРЫЕМ У КРЭМЛІ

На прыёме прысутнічалі таварышы: І. В. Сталін, В. М. Молатаў, Л. М. Кагановіч, К. Е. Варашылаў, М. І. Калінін, В. Я. Чубар, А. І. Мікаян, С. В. Касіор, А. А. Жданаў, Н. І. Ежоў, Г. І. Петроўскі, Р. І. Эйхе, Г. М. Дзімітраў, М. Д. Багіраў

Увечары 17 красавіка ўдзельнікі дэкады азербайджанскага мастацтва былі прыняты ў Крэмлі кіраўнікамі партыі і ўрада. К 18 гадзінам ў Георгіеўскай зале і ў Гранавітай палаце Вялікага Крэмлеўскага палаца сабраліся ўсе ўдзельнікі дэкады, стаханаўцы маскоўскіх прадпрыемстваў, майстры мастацтваў — артысты, кампазітары, мастакі і пісьменнікі, а таксама работнікі навукі і друку.

З'яўленне ў зале таварышаў І. В. Сталіна, В. М. Молатава, Л. М. Кагановіча, К. Е. Варашылава, М. І. Калініна, В. Я. Чубара, А. І. Мікаяна, С. В. Касіора, А. А. Жданава, Н. І. Ежова, Г. І. Петроўскага, Р. І. Эйхе, Г. М. Дзімітрава, М. Д. Багірава выклікала бурную, поўную захаплення авацыю. Доўга грымелі крыкі «ўра» і лікуючыя воклічы прывітанняў на азербайджанскай і рускай мовах.

Вечар адкрыў старшыня Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР тав. А. І. Назараў.

— Сацыялістычная культура расцвітае з кожным днём. Прыкладам можа служыць мастацтва совецкага Азербайджана. Азербайджанскі народ зрабіў каштоўны ўклад у скарбніцу культуры нашай краіны, — гаворыць тав. Назараў.

Тав. Назараў паведамляе, што Камітэт па справах мастацтваў пры СНК СССР вырашыў уключыць у рэпертуар Дзяржаўнага ордэна Леніна Акадэмічнага Вялікага тэатра СССР оперу кампазітара Узеіра Гаджыбекава «Кёр-Оглы» і здзейсніць яе пастаноўку ў 1939 годзе.

Потым выступіў старэйшы дзеяч азербайджанскага мастацтва кампазітар Узеір Гаджыбекаў.

— Нам выпала шчасце, — гаворыць ён, — прадэманстраваць у сталіцы Совецкага Саюза тое, чаго дасягнуў азербайджанскі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна. Работнікі мастацтваў Совецкага Азербайджана заслужылі высокую ўзнагароду: іх бачыў, ім апладыраваў правадыр і настаўнік, родны Сталін, ім апладыравалі кіраўнікі партыі і ўрада.

Калі авацыя ў гонар таварыша Сталіна сціхае, Узеір Гаджыбекаў гаворыць аб вялікім рускім народзе, які дапамог народам Азербайджана ў іх барацьбе за вызваленне.

— Я ўзнімаю бакал, заканчвае сваю прамову тав. Гаджыбекаў, — за гераічную партыю большэвікоў, за правадыра народаў таварыша Сталіна!

Доўга з усіх канцоў залы несліся грамавыя «ўра» і воклічы прывітанняў.

Таварыш В. М. Молатаў агаласіў пад авацыі ўсяе залы тост:

— Няхай жыве Совецкі Азербайджан, яго выдатнае мастацтва, яго творчыя сілы! Ура!

Начальнік Упраўлення па справах мастацтваў пры Соўнаркоме АзССР тав. Ібрагімаў, які выступіў з прамовай на роднай мове, сказаў здравіцу ў гонар таварыша Сталіна.

Усе прысутныя бурна віталі таварыша Сталіна.

З усхваляванай прамовай выступае першая артыстка азербайджанскага народа Шэўкет Мамедава. Яна ўспамінае сваё мінулае. Цаной вялікіх намаганняў і цяжкасцей ёй удалося, парушыўшы законы «шарыата», трапіць на сцэну. 13 красавіка 1912 года Шэўкет Мамедава ўпершыню выступала на азербайджанскай сцэне.

— А праз дваццаць шэсць год — 13 красавіка 1938 года, — гаворыць артыстка, — я ўдзельнічала ў спектаклі, які глядзеў таварыш Сталін і яго саратнікі.

— Я ўзнімаю бакал за брацкі рускі народ, за яго слаўнага сына, саратніка Сталіна — Вячэслава Міхайлавіча Молатава, — заключае Шэўкет Мамедава пад бурныя апладысменты.

Таварыш В. М. Молатаў агалашае:

— Няхай жыве наша вялікая партыя — партыя Леніна — Сталіна! Няхай жыве комуністычная партыя большэвікоў Азербайджана! За здароўе кіраўніка азербайджанскіх большэвікоў тав. Багірава — ура!

У зале раздаюцца воклічы «ўра»

Аб сталінскай дружбе народаў, аб'яднаных у сям'ю Совецкага Саюза, гаворыць салістка Кнарык Грыгар'ян, якая агалашае тост за Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР таварыша М. І. Калініна.

Слова атрымоўвае народны артыст СССР Л. М. Леанідаў.

— Усе тэатры Масквы, — гаворыць ён, звяртаючыся да ўдзельнікаў дэкады, — вітаюць у вашай асобе, дарагія таварышы, мастацтва вольнага, радаснага Совецкага Азербайджана. Вы прынеслі нам сонечнае, яркае, красачнае мастацтва, сагрэлі нас, усхвалявалі нас, далі нам магчымасць перажыць незабыўныя хвіліны.

Што дае нам сілы, хто дае нам натхненне? Сталінская эпоха, наша вялікая партыя, наш совецкі ўрад, якія так выключна клапатліва адносяцца да работнікаў мастацтваў.

Бурнай, працяглай авацыяй суправаджаюць усе прысутныя тост, агалошаны Л. М. Леанідавым, за агульначалавечую сацыялістычную культуру, за нашу магутную сацыялістычную радзіму, за неператожную Чырвоную Армію і яе правадыра — вернага сталінца, маршала Совецкага Саюза таварыша К. Е. Варашылава.

Вялікі поспех меў канцэрт, у якім прынялі ўдзел калектывы Азербайджанскай філармоніі — хор пад кіраўніцтвам Узеіра Гаджыбекава, жаночы аркестр народных інструментаў і жаночы танцавальны ансамбль, салісты Азербайджанскага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя М. Ф. Ахундава — Шэўкет Мамедава, Кнарык Грыгар'ян Бюль-Бюль, Г. А. Гаджыбабабекаў, буйнейшыя артыстычныя сілы сталіцы, у тым ліку народныя артысты СССР В. В. Барсава, А. С. Пірагоў, заслужаныя артысты РСФСР С. Я. Лемешаў, Б. Я. Златагорава, Асаф Месерэр, лаўрэаты міжнародных конкурсаў скрыпач Давід Ойстрах і піяніст Эміль Гілельс.

Выключна цёпла быў сустрэты Чырвонасцяжны ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі СССР пад кіраваннем народнага артыста СССР праф. А. В. Александрава. Ансамбль бліскуча, з вялікім майстэрствам прадэманстраваў выдатныя ўзоры мастацтва Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

АБ ЧЫМ НЕ ГАВАРЫЛІ НА СХОДЗЕ

Комуністы, якія працуюць у Дзяржаўным выдавецтве Беларусі, знаходзяцца на адным з важнейшых участкаў культурнага будаўніцтва. Забеспячэнне выпуску добраякаснай, каштоўнай кнігі і ў патрэбнай колькасці з'яўляецца іх асноўнай задачай. Партарганізацыя ДВБ налічвае 27 членаў і кандыдатаў партыі. Такая, даволі значная, праслойка комуністаў у апараце выдавецтва стварае ўсе магчымасці для выпуску поўнацэннай літаратуры, якой так прагнуць шырокія масы працоўных нашай краіны.

19 і 20 красавіка адбыўся справаздачна-выбарчы сход партыйнай арганізацыі ДВБ, сход, які па сутнасці павінен быў з'явіцца аглядам гадовай работы партарганізацыі, які павінен быў намеціць план і метады работы комуністаў з такім разлікам, каб партарганізацыя выдавецтва магла поўнасцю ажыццявіць палітычную лінію і практычныя ўказанні нашай партыі па выдавецкай справе. Як-жа прайшоў гэты сход?

Тав. Гарбуноў, сакратар партыйнага камітэта партарганізацыі ДВБ, у сваім справаздачным дакладзе расказаў сходу аб тым, што нацыянал-фашысты ў ДВБ мелі сваё гняздо-збарышча. Ворагі народа нямала нашкодзілі на гэтым важнейшым участку сацыялістычнага будаўніцтва. Партарганізацыя правяла вялікую работу па ачышчэнню выдавецтва ад заклятых ворагаў народа. партарганізацыя ліквідуе рэшткі шкодніцтва.

У дакладзе т. Гарбунова была адзначана работа асобных комуністаў, якія ў большасці сваёй нядаўна прышлі на выдавецкую работу, аднак, нядрэнна спраўляюцца з даручанай ім справай. Не засталася без асвятлення партыйная вучоба, работа з комсамолам, работа грамадскіх арганізацый, партыйная гаспадарка, вытворчыя пытанні, рост партарганізацыі і інш.

Аднак, усе гэтыя пытанні поўнага, усебаковага асвятлення не атрымалі. Некаторым пытанням дакладчык даў недастаткова выразныя, чоткія акрэсленні. Так, гаворачы аб партасвеце, тав. Гарбуноў сказаў, што фармальна ўсе комуністы ахоплены вучобай, хоць сур'ёзнай праверкай таго, як пастаўлена вучоба, партком не займаўся. У спрэчках высветлілася, што многія гурткі працуюць дрэнна, заняткі праводзяцца з перабоямі, часта ўсяго 3—4 слухачы прыходзяць на заняткі.

Партыйная гаспадарка партарганізацыі была запушчана. Доўгі час не было кнігі ўчоту комуністаў, а пазней яна вялася нядбайна і да гэтага часу ў ёй запісаны людзі, якія даўно не знаходзяцца ў партарганізацыі. Пратаколы парткома падпісваліся не членамі парткома. Дакладчык, гаворачы аб гэтым, не назваў вінаватых, не сказаў, хто так запусціў партыйную гаспадарку калектыва. Не адразу партком выявіў і тое, што ў справах парткома зусім адсутнічаюць пратаколы за 1927 год. Гэтыя пратаколы загінулі. Калі і як, — дакладчык аб гэтым не сказаў.

Дакладчык заявіў, што план выпуску літаратуры Белдзяржвыдавецтвам складзен добра і што ўжо за першы квартал гэтага года план па здачы рукапісаў выканан на 24,6 проц.

— Намеціўся пералом, — гаворыць дакладчык. Безумоўна, пералом ёсць, калі ўлічыць, што план мінулага года быў выканан па выпуску прадукцыі толькі на 47 процантаў. Але нельга забываць і таго, што па выданай прадукцыі план гэтага года выканан за квартал толькі на 13,8 процанта.

У чым-жа прычына недавыканання плана? І дакладчык і большасць выступаючых спрабавалі зваліць усю віну на друкарню. Толькі ў ёй, маўляў, затрымка з выкананнем плана. І, як сродак выпраўлення гэтага, фігурыруе аднатонная прапанова — правесці аб'яднаны сход з друкарняй і ўскрыць прычыны недавыканання плана, ускрыць прычыны таго, што кніжкі выходзяць з вялікім бракам. А браку яшчэ багата. Так, у выданай ДВБ кнізе «Мёртвыя душы» Гогаля знойдзена 150 памылак. Ёсць прыклады, калі ў друк былі здадзены і нават надрукаваны кнігі з палітычнымі памылкамі і з варожымі ўстаноўкамі. Але і дакладчык і выступаючыя ў спрэчках якраз мала гаварылі аб тым, як пазбегнуць памылак, як дабіцца таго, каб кніга выйшла поўнацэннай.

Высветлілася ў ходзе спрэчак, што і план быў складзен без уліку магчымасцей выдавецтва. Самастрахоўка перавышала ўсякі здаровы сэнс. Так, выданне арыгінальнай літаратуры ў плане выдавецтва займае толькі 28 процантаў. Асабліва дала сябе адчуць самастрахоўка па сектару мастацкай літаратуры. Намечана да выдання багата вядомых аўтараў, пачынаючы ад Бакачыё, прычым нават без перакладу. Так спакайней і прыбытковей, — думаюць у ДВБ. Сектар мастацкай літаратуры не праводзіць ніякай работы з аўтарамі і ў тым ліку з маладымі і пачынаючымі. Тав. Дашкевіч, кіраўнік гэтага сектара, не забяспечыла правядзення гэтай работы, і тав. Яцкевіч, дырэктар ДВБ, у сваім выступленні вымушаны быў прызнацца: «работы з пісьменнікам мы не правярнулі». «Не правярнулі» у ДВБ работы і з перакладчыкамі і з мастакамі, а ў рэзультаце пераклады дрэнныя, афармленне ніжэй усякай крытыкі. кніжкі выходзяць несвоечасова; ёсць факты затрымкі выпуска кніжак на 2—3 гады.

Мала гаварылася на сходзе аб тым, як выправіць недахопы ў рабоце выдавецтва, аб некаторых пытаннях зусім не гаварылася. Так, зусім не было закранута пытанне аб тым, як ДВБ сустракае надыходзячыя выбары ў Вярхоўны Совет БССР. Гаварылася аб гэтай важнейшай палітычнай кампаніі толькі ў сувязі з тым, як комуністы арганізацыі рыхтуюцца да работы на выбарчых участках, але ні слова не было сказана аб тым, якую літаратуру выдае ДВБ да выбараў. Павінна быць выдана каля 30 назваў кніжак. Некаторыя з іх яшчэ пішуцца. Выйдуць, як відаць, са спазненнем. Плакаты і лозунгі таксама яшчэ ў працэсе работы. Для самазаспакоення няма ніякіх падстаў, аднак гэтая важнейшая работа выдавецтва Беларусі не атрымала на сходзе ніякага асвятлення.

Па справаздачнаму дакладу тав. Гарбунова ў спрэчках выказалася 22 таварышы. Сход прызнаў работу парткома здавальняючай. Тайным галасаваннем у склад новага парткома абраны тт. Гарбуноў, Яцкевіч, Падбярэзскі, Ус і Цырлін. Дэлегатамі на раённую партканферэнцыю абраны тт. Гарбуноў і Яцкевіч.

Я. ПАУЛОУСКІ.

ТРЫ ЗАДАЧЫ

Калі мы гаворым аб гістарычнай пастанове ЦК ВКП(б) ад 23 красавіка 1932 года, мне-б хацелася спыніцца на важнейшых задачах, маючых для нашай беларускай совецкай літаратуры важнейшае значэнне.

Я не буду спыняцца на выніках пастановы, — яны для нас надзвычай ясны, — яшчэ і яшчэ раз мы пераконваемся ў празорлівасці нашай комуністычнай партыі, якая сваёй пастановай стварыла найбагацейшыя магчымасці для творчай работы кожнага пісьменніка і мастака, якая абясшкодзіла ў свой час намаганні трацкісцкай агентуры ў кіраўніцтве літаратурай, якая выгнала з літаратуры авербахаў і іншых паганцаў, аказаўшыхся лютымі ворагамі партыі і народа.

Я не буду гаварыць аб рэальных выніках пастановы, аб усіх творчых дасягненнях нашай літаратуры, аб арыгінальных і перакладных працах, якія з'явіліся за апошнія шесць год.

Я спынюся на важнейшых задачах, якія стаяць перад нашай літаратурнай арганізацыяй. Асноўныя творчыя пытанні не мелі свайго патрэбнага месца ў сістэме кіравання ўсім літаратурным жыццём. Я маю на ўвазе работу праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, работу нашай пісьменніцкай партыйнай арганізацыі. Толькі за апошнія часы мы заўважаем некаторае ажыўленне ў нашых творчых секцыях. Не так ужо дрэнна працуе паэтычная секцыя, нельга сказаць, каб адставала ад яе дзіцячая секцыя. Пачынаюць варушыцца секцыя крытыкаў, секцыя празаікаў. Але ніякіх адзнак жыцця не падае важнейшая ў нашых умовах секцыя абароннай літаратуры. Слаба працуе секцыя драматургаў. Няма належнай работы ў секцыі рускіх пісьменнікаў. І секцыі, якія працуюць, праводзяць сваю работу нерэгулярна, а час ад часу, ад выпадку да выпадку. Самыя разнастайныя пытанні ставілі мы на пасяджэннях праўлення, але гэта ў большасці былі арганізацыйныя пытанні, а не непасрэдныя пытанні нашай творчай работы. Чым растлумачыць гэта? Нашай непаваротнасцю, рэшткамі старой руціны, рэшткамі старой пасяджэнчай мітусні, рэшткамі старой шуміхі, калі часам парадамі, што называецца, барабанамі падмянялася глыбокае творчае жыццё ў арганізацыі.

Самыя разнастайныя пытанні ставілі мы ў партыйнай арганізацыі. І нельга сказаць, каб гэтыя пытанні былі другаступеннымі, каб яны не мелі значэння. Але, як-ніяк, прыходзіцца сказаць, што на працягу цэлага года партыйная арганізацыя не здолела паставіць хоць-бы раз пытанне аб творчай рабоце комуніста, аб творчай рабоце беспартыйнага таварыша. Чаму гэта так? «Часу не было...»

Гэта асноўныя нашы недахопы, асноўныя прарывы. І гэтыя недахопы з'яўляюцца законнай прычынай нездаволення пісьменніцкіх мас работай праўлення, работай партыйнай арганізацыі. Гэта бачым мы і ў Маскве, у дачыненні да нашага саюзнага праўлення, гэта бачым мы і ў нас.

Мы прадпрымаем цяпер і павінны прадпрымаць усе меры да таго, каб пытанні творчага парадку паставіць у аснову ўсёй нашай работы. Вось празаікі зацікавіліся цяпер новым раманам Самуйлёнка. Рукапіс размножан, раздадзен таварышам. Ужо намячаюцца цікавыя выказванні, цікавыя думкі. І, бясспрэчна, яны будуць не лішнімі і не бескарыснымі для аўтара, для ўсіх нас, для ўсёй нашай літаратуры. І гэта ўсё — без спецыяльных сходаў, без нудных пасяджэнняў. Вось сабяруцца проста таварышы і пагавораць ад душы, з усёй ахвотай, з сапраўднай зацікаўленасцю, з карысцю для сябе і для аўтара. Трэба дасканала прадумаць усю нашу работу, каб жывую творчую справу не ўганяць у бледныя і сухія схемы, у бюракратычныя планы, у «павесткі на пасяджэнні», якіх так баіцца любы творчы работнік.

Мы падрыхтоўваем пленум нашага саюза, мы ставім на ім рад творчых пытанняў. Агульнымі намаганнямі трэба дабіцца таго, каб не апошліць пленум, не ператварыць яго ў чарговае «пасяджэнне» — з фармальнымі выказваннямі, з сухімі пратаколамі. Пленум павінен даць нам глыбокую творчую зарадку, паслужыць пачаткам карэннай перабудовы ўсёй нашай работы з тым, каб жывая творчая справа стала асновай асноў гэтай работы.

Мы жывем у капіталістычным абкружэнні. Мінулы год даў нам багата канкрэтных доказаў вялікай небяспечнасці для нас гэтага абкружэння, багата фактаў таго, да чаго можа прывесці нас палітычная бесклапотнасць, прытупленне класавай пільнасці. Іосіф Вісарыёнавіч Сталін у сваім адказе прапагандысту Іванову пісаў: «Трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку...» Гэтыя словы да шмат чаго абавязваюць нас. Яны патрабуюць ад нас і павышэння нашай класавай пільнасці, і мабілізацыйнай гатоўнасці нашай даць адпор хоць якому ворагу, і вымагаюць перабудаваць усю работу так, каб ніякі вораг не мог нават падумаць прабрацца ў наша асяроддзе. Словы таварыша Сталіна заклікаюць нас належным чынам мабілізавацца і ў нашай творчасці. Наша мастацкае слова павінна стаць вастрэйшай зброяй партыі і совецкага народа ў барацьбе супроць шматлікіх ворагаў. Кожны наш твор павінен быць у поўным сэнсе гэтага слова абаронным творам.

У прамове, прысвечанай дваццацігоддзю Кастрычніцкай рэвалюцыі, таварыш Молатаў сказаў:

«У нашай краіне сацыялізм перамог поўнасцю ў **палітычнай** галіне яшчэ ў Кастрычніцкія дні 1917 года. Аб канчатковай перамозе сацыялізма ў **эканоміцы** краіны мы можам гаварыць з часу павароту сялянскіх мас на шлях калгасаў, г. зн. ужо 7—8 год. Аб канчатковай перамозе сацыялізма ў галіне **культуры** гаварыць яшчэ рана. З гэтым звязаны той факт, што ў нас яшчэ так багата работы па выжыванню перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей. Іх можна паспяхова выжываць толькі шырокім уздымам сацыялістычнай культуры. Але затое кожны крок па шляху сапраўды сацыялістычнай культуры не толькі дае неадкладныя вынікі, але і стварае прадпасылкі перарастання сацыялізма ў комунізм».

У гэтых словах—цэлая праграма работы для нас, для беларускіх пісьменнікаў. Перад намі, шырокае поле дзейнасці ў галіне культуры. Наш абавязак — дапамагаць усімі сродкамі, усімі нашымі здольнасцямі ўздыму сацыялістычнай культуры. Тут і тэатр, і кіно, і літаратура для дзяцей, і добры падручнік для вучняў, і добрая папулярная брашура аб нашых дасягненнях. Мы робім першыя крокі па стварэнню беларускай арыгінальнай оперы. Яшчэ няма поўнацэннай арыгінальнай камедыі, няма музыкальнай камедыі, мала добрых п'ес, ды, што грэх таіць, — малавата і добрых кніг. Работы ўперадзе надзвычай багата.

Словы тав. Молатава аб выжыванні перажыткаў капіталізма маюць непасрэднае дачыненне і да пісьменнікаў, як людзей, да палітычна літаратурнай выхаваўчай работы ўнутры арганізацыі. У свой час В. І. Ленін пісаў: «У параўнанні з пролетарыятам інтэлігенцыя заўсёды больш індывідуалістычна ўжо ў сілу асноўных умоў свайго жыцця і работы, якія не даюць ёй непасрэдна шырокага аб'яднання сіл, непасрэднага выхавання ў арганізаванай сумеснай працы» (В. І. Ленін. Творы, том VI, стар. 354)

Безумоўна, наша совецкая інтэлігенцыя, у тым ліку і совецкі пісьменнік, далёка адышлі ад інтэлігенцыі дарэволюцыйнай. Ужо ёсць у яе вопыт масавай арганізацыі, вопыт аб'яднання, найвялікшы вопыт удзелу ў сацыялістычным будаўніцтве. Але перажыткі мінулага даюць яшчэ сябе адчуваць, будзь то рэшткі дробнабуржуазнай ідэалогіі ці абмежаванага індывідуалізма. Чым, як не перажыткамі мінулага, можна растлумачыць факты зазнайства, самалюбавання, урэшце, паасобныя праявы гнілой багемы, якія, праўда, пайшлі на яўную убыль. Чым, як не перажыткамі мінулага можна растлумачыць залішняе захапленне паасобных таварышоў габінетнай работай, баязнь паасобных пісьменнікаў адарвацца ад наседжанага праседжанага крэсла, баязнь акунуцца з галавой у шырокі і глыбокі струмень нашага жыцця. Часам паасобны пісьменнік упадабляецца старому саматужніку-адзіночку, так званаму халоднаму шаўцу—сядзіць сабе чалавеча, калупае няхітрым шылам, кладзе літаратурныя лапікі—і не дбае аб нашым шырокім свеце, аб хвалюючым жыцці, аб сапраўды хвалюючых тварах.

Чым, як не перажыткамі мінулага можна растлумачыць факты падмены сапраўднай творчай дружбы, творчага садружаства гнілой групаўшчынай. А праявы гэтай групаўшчыны яшчэ не выжыты канчаткова з нашай літаратурнай рэчаіснасці.

Багата можна гаварыць аб гэтых поганых перажытках. Інжынеры чалавечых душ павінны ў першую чаргу выжыць гэтыя перажыткі, ліквідаваць іх у саміх сябе, каб з гонарам звацца тварцамі сацыялістычнага мастацтва.

Адсюль багата якіх задач устае перад намі ў сэнсе наладжвання належнай унутрывыхаваўчай работы, прывіцця навыкаў калектыўнай работы, перабудовы ўсёй сістэмы нашай творчай работы, на аснове глыбокай дружбы, узаемнай творчай дапамогі, агульнай зацікаўленасці ў росце маладых кадраў і дапамогі ім.

Вось тыя некалькі думак, якімі мне хацелася падзяліцца ў дзень гістарычнай пастановы ЦК ВКП(б).

МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ.



НА ЗДЫМКУ: новае выданне Музгіза — «Песня пра батыра Ежова» (тэкст народнага песняра Казахстана Джамбула, музыка В. Шафраннікава).

М. ІЛЬІНСКІ

АРТЫКУЛ 102

Кіраўнік гуртка — маладая настаўніца захоплена тлумачыла VIII раздзел Канстытуцыі.

Твары слухачоў былі напружаныя. Адчувалася, — людзі хочуць зразумець самае важнае, галоўнае, але яно губляецца ў агульных словах.

Раптам, калі настаўніца пачала тлумачыць 102 артыкул, яе перапыніў чалавек сярэдніх год. Рэзка акрэслены твар яго, асветлены чырвонымі праменнямі закату красавіковага сонца, здаваўся, палаў. Але галоўнае, што здзіўляла ў ім, — былі зусім белыя валасы; пазалочаныя сонцам завіткі іх, нібы ззянне, акантоўвалі круты, гладкі лоб, перарэзаны глыбокай зморшчкай.

Чалавек пачаў гаварыць.

«Я сядзеў у акопах, прайшоў праз грамадзянскую вайну...

Шмат давялося перажыць, шмат давялося бачыць чалавечых пакут і крыві...

Але валасы мае збялелі ў «мірны час».

Ен момант моўчкі глядзеў на вуліцу. Здавалася, там, за цьмянымі шыбамі вакна, праходзяць перад ім малюнкі даўнейшага жахлівага жыцця.

«Памятаю, была яркая раніца. Бывае, ведаеце, увосень паветра такое сцюдзёнае і празрыстае, нібы шкляное. Дыхаецца нейк лёгка, і на сэрцы весела, і ног пад сабой не чуеш, і прагора ўсялякае забываешся... А тады — тады мне было толькі восемнаццаць год — зямля пад нагамі гула.

Вось у тую раніцу, праходзячы праз рынак (дзе цяпер парк), гляджу — валакуць жандары майго сябра Зенчанку, — збітага, скрываўленага.

У той час у нашай Ветцы такія выпадкі здараліся — арыштоўвалі, білі. Шкада мне таварыша, але падыйсці баюся; пачаў людзей распытваць...

І тут я ўпершыню, — заўважце, упершыню, — пачуў, што напярэдадні абрабавалі сына памешчыка Харашунова з «Радугі» (дзе цяпер калгас). З Гомеля прыехаў спраўнік Мізгайла і арыштоўвае ўсіх «падазроных».

Тут мне сэрца нібы абцугамі сціснула:

— Няўжо-ж, — думаю, — прыяцель мой — Зенчанка?..

Неба было празрыста-блакітнае, а тут адразу здалося нейкім шэрым. Не ўсцешыла мяне і сонца.

Так, са смуткам, прышоў і на работу».

Агорнуты ўспамінамі, чалавек змоўкнуў, але зараз-жа, нібы страсаючы з сябе іх цяжар, прадаўжаў:

«Не паспеў я распаліць у горне вугалле, — у кузню ўваліліся жандары...

Хвілін праз пяць я быў ужо разам з Зенчанкам — у кутузцы».

— За што?!

«Вось так мы тады адзін у другога і пыталіся, седзячы... не! — стоячы ў кутузцы,—сесці не было дзе, бо арыштавалі ўсіх хлапцоў ад шаснаццаці і да дваццаці сямі год. Як ёсць, усіх веткаўскіх работнікаў—саматужнікаў: бондараў, цесляроў, кавалёў, муляроў, шаўцоў, канатчыкаў...

Стаім мы ў кутузцы і адзін другому не верым...

Не ведалі-ж мы тады, што гэта харкаўскія анархісты экспрапрыіравалі Харашунова.

Ці варта расказваць, як пакутвалі мы ў той кутузцы, — глупства гэта, калі параўнаць, што пасля было».

Нібы набіраючыся сіл, чалавек глыбока ўздыхнуў.

«На другі дзень пачалі нас прад'яўляць Харашунову і яго дваровым...

Спраўнік паказвае ім на мяне і кажа:

— Чаго вы хочаце — вось злачынец; у яго смуглявы скуласты твар. Чаго вам яшчэ трэба?

А Харашуноў яму:

— Злітуйцеся, — кажа, — у таго былі зыркія, спрытныя вочы. нахабны выгляд, а галоўнае — яму было не менш, як год дваццаць шэсць; а гэта-ж восемнаццацігадовы хлопчык...

Калі мяне выводзілі, пачуў яшчэ, як спраўнік сказаў Харашунову:

— Вы баіцеся яго помсты, таму і не прызнаеце.

Вось як!

Ад гэтага часу спраўнік пачаў мяне «дапытваць». Гэтыя «допыты» цягнуліся цэлы тыдзень»...

Чалавек змоўкнуў, хвіліну вагаўся, а затым цяжкім, заглушаным голасам прамовіў:

«Ужо пры совецкай уладзе я ўставіў сабе залатыя зубы...

Так мяне спраўнік дапытваў, але я не прызнаваўся...

Тады ён аддаў мяне ў паліцэйскую казарму — жандару Рыдкіну»...

Па твары чалавека прабегла сударга.

«Калі праз дваццаць дзён Рыдкін прывёў мяне на допыт, я... «прызнаўся» у злачынстве...

Можаце не паверыць мне, таварышы... Але калі побач са следчым сядзіць спраўнік, які тыдзень вас «дапытваў», а на патыліцы сваёй адчуваеш дыханне жандара, які дванаццаць дзён ламаў і выкручваў вам рукі, працінаў іх вяроўкай... па тры дні не даваў вам есці; біў галавой аб сценку!..»

Голас чалавека задрыжаў і сарваўся...

«Эх!.. Не папаўся ён мне ў рукі!»

Чалавек перамог хваляванне і прадаўжаў ужо больш спакойна:

«Калі бачыш перад сабой аднаго ката, а на патыліцы адчуваеш дыханне другога, тады здаецца:—няхай катарга, няхай смерць, але... унікнуць, спыніць, адтэрмінаваць гэтае катаванне!..

Я плакаў ад крыўды, ад агіды да самога сябе і... «прызнаваўся»...

«Прызналіся» яшчэ чатыры хлапцы.

Нас судзілі і прыгаварылі на катаргу.

Хоць прысуд набываў моц толькі пасля адхілення апеляцыі, — нас зараз-жа закулі ў кайданы».

Апошнія словы чалавек вымавіў скрозь зубы і ледзь чутна. Ен хвіліну маўчаў, а затым, стрымліваючы хваляванне, расказваў далей.

«Калі мяне катавалі, судзілі — была надзея, што гэта скончыцца, што высветліцца ўсё, як ёсць... — была надзея. Гэта, мусіць, у кожнага так. І яшчэ было адчуванне, што я, хоць зняважаны, але ўсё-такі чалавек — жывы чалавек. А вось, калі куюць у кайданы, — гэтае адчуванне траціцца. Здаецца — усё ўжо скончана. Ужо няма ні на што ніякай надзеі. Чалавечае адчуванне гіне, бо ты робішся зусім,— як ёсць зусім, — рэччу. Гэта такі жах, што ўявіць яго, здаецца мне, можа толькі той, хто сам гэта перажыў.

Я не памятаю, як гэта адбывалася. Але, калі пачалі закоўваць, мне хацелася крычаць, біцца, зрабіць нешта надчалавечае. Ды ўся істота была паралізавана да таго, што не мог не толькі крануць пальцам, нават застагнаць...

Калаціла шалёная ліхаманка... ляскалі зубы...

Кашуля зрабілася мокрая...

Напэўна, вочы былі шырока раскрытыя, нерухомыя, і стаяў у іх бяздумны жах...

Напэўна так, бо такія вочы былі ў маіх таварышоў...»

Чалавек цяжка дыхаў.

«Сенат скасаваў прысуд і нас адпусцілі».

Ен гаротна ўсміхнуўся.

«Маці не пазнала мяне.

Не пазнаў сябе і я сам: чорныя валасы — зрабіліся белымі.

Вось як, таварышы, некалі шанавалі чалавека.

А сёння мы жывем у краіне, дзе няма здзеку чалавека з чалавека. Гэта вялікае шчасце, якое цяжка зразумець таму, хто не бачыў жывога жандара. Але я... я ведаю гэтаму цану. І калі я чытаю 102-гі артыкул нашай Канстытуцыі, ён мяне хвалюе. І не таму, што ён забяспечвае недатыкальнасць маёй асобы. У нашай краіне кожны чэсны чалавек заўсёды быў упэўнен, што яго ніхто і пальцам не кране. Гэты артыкул — сведка вялікага клопату аб чалавеку-грамадзяніну. Такіх артыкулаў у нашай Канстытуцыі шмат. Усе яны прасякнуты гэтым клопатам і чуласцю. І няма... няма, таварышы, такіх слоў, якімі можна было-б выказаць падзяку за Канстытуцыю яе творцу!».

Успыхнула электрычная лямпачка, яе дрыготкае святло замільгала па тварах гуртkoўцаў. Яны былі ўсхваляваны. Вочы некаторых блішчэлі вільгаццю слёз.

Галоўнае было знойдзена і адчута.

Ветка. Красавік, 1938.

МАГІЛЕЎ

НАРЫС

Хв. ШЫНКЛЕР

У сваёй шырокавядомай паэме «Магіла льва» Янка Купала скарыстаў адно з рамантычных паданняў, якія бытуюць, перадаючыся з вуснаў у вусны у народзе. «Магіла льва»—чуллівая гісторыя разбітага кахання асілка-юнака Машэкі да красуні-дзяўчыны Натальні, якую прывабіў і спакусіў пан. Абражаны юнак становіцца разбойнікам, забівае пана-спакусніка, але і сам трагічна гіне ад рукі былой сваёй каханай Натальні.

Яго высокую магілу —
Дзе лес ды вецер панаваў —
Знаць, што вялікую меў сілу,
«Магілай льва» народ пазваў.
Над ёю з часам дрэвы цалі,
І горад вырас, як з зямлі,
Яго Магілевам назвалі,
Бо йнакш прыдумаць не маглі.

Паданне пра Машэку нясе ў сабе і адну з народных версій пра заснаванне і назву горада Магілева. Сівую мінуўшчыну гэтага старадаўняга беларускага горада народ звязаў не з адным прыгожым паданнем, гераічнай легендай, як, напрыклад, паданне пра разбойнікаў Гвазда, Магілу ды інш. І усім слушна зазначае паэт у згаданай намі паэме:

Нам продкаў кемкасць захавала
Шмат весцяў дзіўных з быўшых
год,
Хоць гэтых весцяў ўжо нямала
У няпамяць кінуў сам народ.

— Не абмінулі Магілева і старадаўнія летапісцы. Кожны з іх, клапоцячыся пра ўслаўленне свайго ўладара-князя, гонар заснавання Магілева лічыць ягонай заслугай. Але ў сцвярджэннях летапісцаў не менш легендарнага, чым ў народных паданнях.

Аднак, сярод падаўцаў «весцяў дзіўных з быўшых год» знаходзім мы і такіх, у якіх рацыянальнае мысленне пераважае пад узлётам фантазіі. Вось што гаворыць пра свой родны горад адзін вершатворца ў 1625 годзе:

От могилок Могильов чому бы
прозвано?
Вежу за герб при праве Майде-
бургском дано?
С тых мер, жеби мешканцы на
смерть памятали,
А над цноту вышшого ничога не
знали,
Пры совитой до бога и до пана
вере,
Без одмены сталыми были в каждой
мере.
Даючи дань, повинность, почесть
ведлуг стану:
Духовенству от души, а од тела
пану.

Нельга не згадзіцца з аўтарам гэтых выразных радкоў, не абвяргае іх і навука. Так, археалагічныя раскопкі ў ваколіцах і ў межах горада выявілі стаянкі людзей каменнага веку — гарадзішчы, у якіх знойдзены рэчы славянскага ўжытку. На месцы горада было раней шмат курганоў, ад іх і атрымала сваю назву паселішча, якое ў больш познія часы ператварылася ў горад. Гісторыя-ж, пацвярджаючы даўнасць горада Магілева, пералічае безлічны рад узрушаючых падзей, сутнасць якіх акрэсліў у апошніх радках свайго твора разважны вершаскладальнік.

Так, доўгія стагоддзі гаражане магілеўскія, гнучы горб свой у працы надмернай, слугавалі і дань давалі «духовенству от души и од тела пану». Але не адзін раз, у гнеўнай роспачы, бунтавалі душа і цела нявольніка, і тады вялікая дакука і непрыемнасць была і духаўніку і пану.



Магілеўскі Дом піянераў і акцябрат.

Гістарычныя крыніцы пачатку XVI стагоддзя даюць першыя дакладныя весткі аб Магілеве. З іх відаць, што ў канцы XIV стагоддзя Магілеў з воласцю падпаў пад уладу літоўскага феадальнага княжаства і пераходзіў ад аднаго княжацкага дзяржаўцы да другога. Кожны з іх старанна «выбіраў пенязі» на свой «пракорм» і ў «гаспадарскі скарб». Што-б ні рабіў гаражанін магілеўскі, да чаго-б ні прыкладаў свае рупныя рукі, — да ўсяго гэтага меў дачыненне пан дзяржаўца. Выбіраў гэты пан дань грашовую за зямлю, дань скоцкую, срэбравую, спагаваў бабpоўшчыну і васковае, браў натурою ялавіц, жыта, сена, мёд, куніцы, рыбу. Скваппы быў дзяржаўца князеў, ён учыняў «вялікія драпествы і цяжкасці». Князь-жа літоўскі дбаў аб адным: каб абрабаваныя магілеўцы яму «не чынілі вялікае дакукі».

У 1503 годзе, калі ў Магілеве быў заснаван замак — драўляны астрог, мусілі магілеўцы адбываць яшчэ замкавую павіннасць. Замак і парканы скончылі будаваць у 1526 годзе, але знайшлася новая павіннасць: правіць астрог і парканы, рабіць вакол іх перакопы.

Ля ўтокі ракі Дубровенкі ў разложысты, глыбокі Дняпро, на высокай і стромкай гары стаяў моцны астрог магілеўскі. За сценамі яго разбегся шырокі рынак з рознымі крамамі і мяснымі яткамі. З усяе воласці на рынак збіраліся сяляне, яны гналі на продаж коней, валоў, ялавіц, свіней, коз, авечак, везлі на вазах мёд, лой, салініну, рыбу, проса, яблыкі, арэхі, хмель, воск, рагожы, луб, сена, смалу, дзёгаць. З тлумнага рынку ішлі ў вузкія вулкі: да рамеснікаў, каб купіць гарадскіх вырабаў. Былі тут рамеснікі—кушняры, кашэўнікі, кавалі, слёсары, бандары, калеснікі, шаўцы, рымары, сырамятнікі, сядзельнікі, ганчары, саладоўнікі.

Купцы магілеўскія часта выпраўляліся ў шырокі свет — у Менск, Вільню, Слуцк, Смаленск, Віцебск, Кіеў, часта наведвалі яны і сталіцу маскоўскага царства. Шырокі Дняпро гойдаў на хвалях сваіх чароды барлін і байдакаў. Па гэтым шляху «из Варяг в Греки» завіталі ў Магілеў купцы з чужых краёў, гандлявалі магілеўцы з Ноўгарадам, Рыгай, Торунем і Гданскам. Не было дзівам набыць на рынку магілеўскім коленскае палатно, расшытае шоўкам, палатно галандскае, швабскае, маскоўскае, дарагое сукно ліонскае, мураўскае.


Горад ужо значна адрозніваўся ад занятках жыхарства ад навакольных паселішчаў, у 1561 годзе ён быў вылучан са складу воласці і пачаў сваё самастойнае існаванне паводле малага Майдэборскага права, — горадам кіруе прызначаны князем войт, горад падзелен на сотні з войтаўскімі сотнікамі на чале. Аднак, абавязкаў і павіннасцей у мяшчан аніяк не паменшыла. Войт і сотнікі збіралі дань, а плаціць трэба было за ўсё, нават ад кожнае нявесты спаганялася дванаццаць грошай.

У 1578 годзе Магілеў атрымаў вялікае Майдэборскае права. Горадам кіруе ўжо абраны з «людзей лепшых» магістрат, войт-жа — прадстаўнік князя, суддзя па справах крымінальных. Рамеснікі аб'ядноўваюцца ў цэхі, купцы складаюць «брацтва».

Працоўнага магілеўскага ўціскаў кароль, уціскаў войт, свайм правам уціскаць лічыў кожны багацейшы і дужэйшы — кожны шляхціч і купец. Зазнаўшы шмат гора, народ прагнуў збавення ад гэтага ўціску. І калі ў канцы 1595 года ў ваколіцах Магілева з'явіліся раздзелы казакаў, паўстаўшых супроць польскіх паноў, на чале з Севяр'янам Налівайкам—да іх далучылася багата магілеўскіх сялян і мяшчан. Налівайка ўзяў Магілеў, але прабыў ён тут усяго два тыдні, учыніўшы за гэты час няшчадную расправу над шляхтай і людзьмі «учпівымі». Да Магілева спяшаўся ўжо гетман літоўскі Радзівіл, ведучы войска з 14 тысяч шляхты і 4 тысяч крымскіх татар. Не спадзеючыся хутка перамагчы казакаў, гетман літоўскі ўжыў выпрабаваны іезуіцкі метад: ён падаслаў дыверсантаў, якія падпалілі астрог. Налівайка выйшаў з горада з абозам, з усім сваім войскам (1 тысяча казакаў і 1 тысяча мясцовых жыхароў). На буйніцкім полі Налівайка паставіў свае войска тылам да Дняпра, з трох іншых бакоў абгарадзіўся табарам. Ад ўсходу да захаду сонца трываў зацяты бой. Забіўшы літоўскага палкоўніка Аніхоўскага, казакі адагналі войска Радзівіла. З надыходам ночы Налівайка зняўся з табара і рушыў па Дняпру да Быхава і далей на Чарнігаў. Каб узнагарадзіць сябе за няўдачу, шляхта падзялілася на тры атрады і выправілася «на луп» — рабаваць і нішчыць вакольнае сялянства.

Не адзін раз падпадаў беларускі народ пад няшчадны «луп» шляхоцкіх шаек. Скваппыя вочы шляхты і караля пачалі зазіраць і далей на ўсход. Яны наважыліся ўчыніць свой «луп» і над рускім народам, выправіўшы з войскам Ілжэдзімітрыя, каб захапіць прастол маскоўскага царства. Калі рускі народ паўстаў супроць палякаў, выгнаў іх і забіў Ілжэдзімітрыя, кароль знайшоў другога прайдзісвета—Ілжэдзімітрыя II. Гэты польскі авантурнік з'явіўся ў Магілеве, падбіваючы народ ісці з ім на Маскву. Народ не пайшоў. Ен выкрыў авантурніка: у «цару Дзімітрыю» магілеўцы пазналі Дзмітра Нагога, які яшчэ нядаўна ў магілеўскага папа Сасіновіча дзяцей грамаце вучыў і жыў у праскурніка Цярэшкі. «Цара Дзімітрыя» затрымалі і перадалі ўладзе. Не ведаў народ, што гэтая ўлада — адна хеўра з Натім. Хутка ён быў вызвален з прапойскага астрога чачэрскім урадпікам Рагозай і рушыў на Маскву на чале дзесяці тысяч польскага войска. Былі-б магілеўцы больш дальнабачнымі — не пацярпеў-бы братні рускі народ шмат гора ад польскага авантурніка, слушна празванага «Тушынскім злодзеем».

У воласці Магілеўскай сваволіла шляхта, у горадзе ад яе не адставалі паны бурмістры і райцы магістрацкія. Абіраўся магістрат з вышэйшых станаў, у вузкім коле, «са сваімі прыяцелямі». Магістрат не жадаў лічыцца з народам, не рабіў справаздач, свавольна ўводзіў падаткі і абкладанні, раскрадаў магістрацкія сродкі. У народзе расло абурэнне і ў чэрвені 1606 года гэта абурэнне прарвалася нябачаным дагэтуль выбухам. Некалькі сот гаражанаў прыйшло да ратушы. Былі тут шабельнікі, краўцы, фурманы, калачнікі, саленікі, ганчары, чабатары, кавалі, кушнеры. Яны ўчынілі «бунт і ростыркі», — «пагражаючы здароўю» паноў магістрацкіх, захапілі ратушу і прымусілі пісара здаць справы і пячаць. Тут-жа быў абран новы магістрат з людзей «лёгкіх», часткаю нават непісьменных.



Стаханаўка машынабудаўнічага завода імя Дзімітрава тав. НЕУСКАЯ З. С.

Стары склад магістрата паскардзіўся войту Ярашу Валовічу. Войт патрабаваў вярнуць стары магістрат да кіравання горадам. Гэты прысуд зацвердзіў кароль. Аднак магістрат, абраны народам, не падначаліўся і каралю, ён не здаў улады і два гады яшчэ кіраваў горадам. Тады кароль «пакараў горлам» — адсячэннем галавы бурмістра Хоцьку Багдановіча.

Хоць устрашаны новы магістрат і пагадзіўся са старым, але не пагадзіўся народ, два гады яшчэ трываў у горадзе неспакой і непадначаленне каралеўскай уладзе. У 1610 годзе войт Яраш Валовіч учыняе суд над «бунтаўнікамі». Першы дзень суда адзначыўся вялікім узрушэннем у народзе. Трывожна гудзеў набат, народ рушыў да ратушы, штурмаваў яе, ломячыся ў дзверы. Толькі праз чатыры дні войт здолеў прадоўжваць суд. Ен асудзіў да кары смерцю праз адсячэнне галавы пяць галоўных выяўнікоў гневу народнага. Праз два дні на Ільінскай гары, на ўстрашэнне насельніцтва, прысуд войтаўскі быў выканан. Шмат гаражанаў войт выгнаў з горада, адабраўшы іхнюю маёмасць. Так расправіўся каралеўскі ўрад з народам, што не сцярпеў гвалту і несправядлівасцей. Але не маглі паны і падпанкі зламіць волю народа, яго прагу да лепшага жыцця. Не адзін раз запаляўся народ справядлівым гневам, страшачы сваіх паноў і ўладароў.

Паны пачалі шукаць спосабу, каб хутчэй і лягчэй ачмурыць просты народ, канчаткова заняволіць яго і апалячыць: яны пачалі дзейнічаць праз ксяндзоў, гвалтам шырылі унію праваслаўнай царквы з каталіцкай. Разам з беларускай шляхтай, што прадала свой народ за ласку польскіх каралёў, яны выправілі ў 1618 годзе ў Магілеў вядомага уніяцкага арцыбіскупа Іёзафата Кунцэвіча, упэўненыя, што ён лёгка пераканае непакорных магілеўцаў і паверне іх да уніі. Як толькі, прачулі гаражане пра няпрошанага госця, яны замкнулі вароты, сталі на сценах астрога і папярэдзілі, што сустрэнуць яго боем гарматным. Святы пасланец хуценька павярнуў назад. І зноў некалькі адважных магілеўцаў склалі свае галовы пад сякерай ката каралеўскага. Але яны былі адпомшчаны: Іёзафат Кунцэвіч быў забіт ў Віцебску праціўнікамі уніі, сярод якіх было некалькі магілеўцаў.

Казацкае паўстанне супроць польскіх паноў (1648 год), якім кіраваў Багдан Хмельніцкі, адгукнулася моцным рэхам і на Магілеўшчыне. У загон казака Гладкага пайшлі мясцовыя сяляне. Да Магілева дайшлі чуткі, што казакам дапамагае маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч, ды і войска царскае было ўжо ў блізкіх валасцях. Мяшчане магілеўскія надумаліся падацца да маскоўскага, адзінае з імі веры, цара. У 1654 годзе Магілеў без боя здаўся рускаму войску. Царскія ваяводы і палкоўнікі, аднак, мала дбалі аб інтарэсах горада і воласці, яны больш клапаціліся аб сваіх набытках — рабавалі сялян, прыгняталі мяшчан. Самі-ж між сабой жылі ў сварцы, а цар суцяшаў гаражанаў сваімі прывілеямі: урачыста замацаваўшы ўказам самакіраванне горада, ён аказаў новую «ласку»: забараніў яўрэям жыць у горадзе, аддаў палову іхных дамоў пад загад магістрата, а палову пад стралецкі пастой. Гэты «прывілей» цара Аляксея жахліва скарыстаў палкоўнік Паклонскі. Загадаўшы рыхтавацца да высялення ў Літву, ён вывеў 7 тысяч яўрэяў за Пячэрск, тут абрабаваў і па-зверску ўсіх забіў.

Спіхлыя да пары-да часу прыхільнікі польскіх паноў арганізавалі змову. Ранішай 1 лютага 1661 года зазваніў звон. Змоўшчыкі кінуліся на стральцоў і ўсіх іх перабілі. Магілеў зноў папаў пад Польшчу.

У 1668 годзе ў Магілеве асталёўваецца іезуіцкая місія, закладаюцца кляштары, касцёлы. Шляхта робіцца больш нахабнай, заносчывай. Больш за ўсё даўся ў знакі мяшчанам шляхціч Зяньковіч, які, толькі з'яўляючыся на вуліцы, ужо крычаў: «ганяць, біць, топіць» («гнаць, біць, тапіць»). Ен здзекаваўся, збіваў народ на поўную сваю пацеху. Але — як гукнулася, так і адгукнулася. Добра наслухаліся магілеўцы шляхецкай пагаворкі і прыставалі яе да самога пана Зяньковіча. У адзін гожы дзень (гэта было ў 1692 годзе) яны гуртом пагналіся за ім, загналі ў касцёл і пачалі біць. Трэба было-б тапіць яшчэ пана, але не пашэнціла яму на гэтую ўцеху: сканаў заўчасна ад шчодрага бою дужых рамеснікаў. Жудаснай была каралеўская кара: некалькі чалавек паклалі галовы пад сякеру, а дамы іх і іншых удзельнікаў расправы над шляхціцам былі разбураны і з цэглы тых дамоў быў пабудаван кармеліцкі касцёл з выяўленнем трупы на франтоне.

Урачыстаавалі іезуіты, на крыві народнай будуючы свае цытадэлі. Націск пальшчызны на беларускае насельніцтва Магілева ўзмацняецца, у 1697 годзе судаводства вядзецца ўжо на польскай мове. Спрадвечная нянавісць насельніцтва да польскай шляхты, да паланізатараў набывае затоеныя формы, народ заўсёды насцярожаны да паноў.

У 1706 годзе, у часе вайны са шведамі, Магілеў наведаў Пётр I і правёў тут агляд войскаў. Магістрат сустрэў яго з хлебам-соллю, пры праездзе па гораду цара віталі гарматнымі залпамі. Цар быў здаволены і прамовіў да світы:

— Право, изрядно!

Давялося магілеўцам пабачыць і шведскага караля Карла XII, які атрымаў тут мянушку «сатаны» — за вялікі ўціск, непамерныя кантрыбуцыі, адбіранне прадуктовых запасаў. У 1708 годзе горад, ператвораны шведамі ў апорны пункт, быў спален па загаду рускага камандвання. У наступным годзе Пётр I дазволіў адбудаваць горад і вызваліў яго жыхароў ад ўсякіх падаткаў.

У 1772 годзе, пры першым раздзеле Польшчы, Магілеў канчаткова ўваходзіць у склад Расійскай дзяржавы, робіцца ў 1778 годзе цэнтрам Беларускага намесніцтва і набывае рысы тыповага губернскага горада.

Вайна 1812 года не абмінула Магілева. Недалёка ад горада, ля Дашкаўкі, адбыўся бой авангарда II арміі (Баграціёна) пад камандаваннем Раеўскага з французскім корпусам Даву. Французы былі адкінуты да Салтанаўкі. Бой гэты даў магчымасць II арміі прайсці на злучэнне з усімі сіламі рускіх войскаў. Французы занялі Магілеў, насельніцтва было гвалтам прыведзена да прысягі Напалеону, з ахвотай пайшлі на гэта толькі епіскап Варлаам Шышацкі ды шляхта. Французы даліся ў знакі магілеўцам сваім марадзёрствам. Адышлі яны з Магілева спехам, не ўправіўшыся знішчыць горад: яны паспелі толькі спаліць на рынку свой абоз.

У 1815 годзе Магілеў зрабіўся галоўнай кватэрай I арміі. Дзейнасць гэтай кватэры памятна гаражанам першым допытам мужнага дзекабрыста Пестэля пры пераводзе яго ў Пецярбург. Допыт меў адну сімвалічную адзнаку: ён адбыўся ў памяшканні іезуіцкай калегіі.

Ціхай плынню бегла жыццё губернскага Магілева. «Айцы горада» зрэдку выяўлялі «клопаты» аб дабрабыце гаражанаў і тады горад узбагачаўся то гарадскім садам, то сталым памяшканнем тэатра, збудаваным — дарэчы — на сродкі, сабраныя большай часткай па падпіснаму лісту. Якія высокія мэты мелі шаноўныя «айцы горада» ў гэтых сваіх пачынаннях, вельмі яскрава паказала газета «Могилевские губернские ведомости», якая з повадү ўрачыстага адкрыцця тэатра пісала:

«Асаблівa публіка была задаволена апошняй па парадку анонса п'есай «Сямейныя тайны», якая мае за сабой не толькі сцэнічнасць, але і добрую частку сапраўды камічных палажэнняў».

Аналізуючы «сцэнічнасць» п'ес, падобных на згаданыя «Сямейныя тайны», рэцэнзент піша:

«Пастаноўкай іх рэжысёры твораць цуды над публікай і не менш над сваёй трупай, ствараючы часта з нічога сцэны, што атуманьваюць вочы гледачоў. Галёрка, ды што галёрка! — сам добра выхаваны партэр застаецца задаволеным»... «і выклікам канца не было. Каб не меў тэатр наш гранітнага падмурку, ён, вядома, праваліўся-б ад грому воплескаў. Чуліся, вядома, і бурканні, але гэта былі гласы ў пустыні паноў скептыкаў. А ці варта размаўляць са скептыкамі! Хто не ведае, што гэта народ прапашчы. Яшчэ Грыбаедаў сказаў: «как можно сметь свое суждение иметь».

Далей жыццё горада адзначаецца такімі падзеямі, як пабудова рэальнага вучылішча, абшчыны чырвонага крыжа, богаўгодных устаноў. Сапраўды немалаважнай падзеяй было адкрыццё ў 1902 годзе руху па чыгунцы. Горад атрымаў надзейную і хуткую сувязь з суседнімі гарадамі, з цэнтрамі краіны.

Японская вайна, пачатая царызмам, каб заглушыць незадаволенства народа, адцягнуць наспеўшую рэвалюцыю, не спраўдзіла спадзяванняў царызма — расла самасвядомасць мас, нянавісць да царскага ўрада. Манархісты кілаюцца да выпрабаванага сродку: яны арганізуюць пагромы. 1904 год памятны магілеўцам жудасным яўрэйскім пагромам, наладжаным чорнай сотняй.

Студзеньскія падзеі 1905 года, «крывавая нядзеля» мелі шырокі рэзананс у Магілеве. На прадпрыемствах выбухнула забастоўка. Магілеўская арганізацыя РСДРП выдала лістоўку, у якой заклікала працоўных далучыць свае галасы да «ўсерасійскага хора, які спявае вечную пагібель самадзяржаўю—усерасійскаму кату». Адбылася дэманстрацыя. З чырвонымі сцягамі, са спяваннем рэвалюцыйных спеваў праходзілі рабочыя, служачыя і вучнёўская моладзь па Вялікай Садовай (цяпер Ленінская) вуліцы. Раптам з усіх двароў на дэманстрантаў накінуліся гарадавыя. Яны секлі шаблямі, не гледзячы, на ўсе бакі. Шмат дэманстрантаў было цяжка паранена.

Чорная сотня да часу ўрачыствавала. Рабочыя збіралі сілы, гуртаваліся вакол магілеўскай арганізацыі Палескага камітэта РСДРП.

А сілы рэакцыі скалачвалі зграі пагромшчыкаў. Відную ролю ў мерзкай рабоце чорнай сотні адыгрываў епіскап Стэфаній, які звярнуўся да епіскапаў усяе Расіі з заклікам далучыцца да магілеўскага духавенства, што «выпрацавала сваю праграму для стварэння сярод духавенства епархіі, а праз яго і сярод іншых пластоў насельніцтва асобай патрыятычнай-манархічнай партыі». Духавенства магілеўскае, як заўсёды, было верным дапаможнікам катаў.

У часе імперыялістычнай вайны Магілеву суджана было зрабіцца на значны час другім цэнтрам Расійскай Імперыі, — тут была царская стаўка. Губернатарскі дом быў спехам перайменаваны ў палац і ў ім змясціўся Нікалай II — апошні цар Расіі. Ен кіраваў франтамі, слухаючыся парад істэрычкі-царыцы, каранаванай шпіёнкі, ды «святога старца» Распуціна. Бяздарныя генералы вялі армію да паражэнняў, а цар цешыў свой хваравіты гонар, наладжваючы парады георгіеўскіх батальёнаў, ды агляды здабытых у баях



Першамайская вуліца ў Магілеве.

нямецкіх сцягаў. У Магілеў ён вярнуўся з аднае свае паездкі проста палкоўнікам Раманавым, адсюль-жа яго ўбраў пераможны народ. У стаўцы асталёўваецца генерал Карнілаў і яна робіцца цэнтрам контррэвалюцыйных задумаў і планаў. Але рэвалюцыя ішла наперад, нават апора стаўкі — георгіеўскі батальён перайшоў на бок народа. Стаўка — стала рэвалюцыйнай.

20 лістапада 1917 года — амаль на месяц пазней цэнтраў — Магілеў стаў савецкім.

Меншавікі, эсэры, бундаўцы, здраднікі ўсіх колераў разгарнулі падрыўную работу і ў Магілеве. Збіраецца першы губернскі З'езд Саветаў. Здраднікі прыкладаюць усе намаганні, каб накіраваць з'езд на шлях здрады. І тады з трыбуны прагучэў мужны голас бальшавіцкай страснасці і праўды. Сціслая газетная інфармацыя так перадае змест гэтае прамовы, спапяліўшай усе манеўры здраднікаў: «Устаноўчы збор павінен быць склікан, але калі ён пойдзе супроць савецкай улады, калі ён стане штабам контррэвалюцыі, што прыкрываецца лозунгам «уся ўлада ўстаноўчаму збору», дык мы міндальнічаць не будзем. Не ўстаноўчы збор, а рэспубліка Саветаў ёсць пераходная форма да соцыялізма».

Так гаварыў дэлегат Гомеля, член Палескага камітэта РСДРП, верны вучань Леніна і Сталіна — Лазар Майсеевіч Кагановіч.

З'езд вітаў прамову прадстаўніка бальшавіцкай партыі. З'езд прыняў пастанову поўнасцю падтрымаць савецкі ўрад, выконваць дэкрэты Соўнаркома і павесці рашучую, бязлітасную барацьбу з усякімі праявамі контррэвалюцыі.

Разам з большасцю гарадоў Беларусі перажыў Магілеў нямецкую акупацыю. У 1920 годзе з захаду насоўваецца новая навала — гарады і вёскі Беларусі займалі легіёны Пілсудскага, несучы з сабой прыгнёт і няволю, здзек і рабунак, гэтак памятныя па далёкаму жудаснаму панаванню раз'юшанай польскай шляхты. Белапанская навала не дакацілася да Магілева, яе спыніла, скамячыла і адкінула назад Чырвоная Армія. У памяці сваёй захоўвае і шануе савецкі Магілеў найярчэйшы эпізод барацьбы з белапалякамі, калі на подступах да горада 19 чэрвеня 1920 года невялікі 35-ты Магілеўскі аўтабронеатрад даў бой у шмат разоў перавышаўшым яго колькасцю польскім палкам. Несучы страх і замяшанне, сеючы смерць у варожых калонах, ішоў наперадзе атрада бранявік «Здань Валадарскага». Паны адступілі ў беспарадку.

Разам з усёй краінай былы шматпакутны Магілеў пачаў будаванне новага, шчаслівага жыцця, здзяйсняючы адвечныя мары многіх пакаленняў свайго насельніцтва. У 1923 годзе горад уваходзіць у склад БССР, створанай верным вучнем Леніна, правадыром працоўных усяго свету—Сталіным.

* * *

Не трэба выбіраць назіральнага пункту, каб угледзець характар сучаснага нам Магілева, аднаго з квітнеючых гарадоў Савецкай Беларусі. Пры ўладзе Саветаў праз Магілеў прайшла яшчэ адна чыгунка. Вы ўбачыце Магілеў з цягніка, пад'язджаючы да горада з якога хаця боку. Вы можаце і проста прайсці па вуліцах. Яны ўпрыгожыліся новымі камяніцамі. Сталінскія пяцігодкі змянілі характар і напрамак жыцця горада, яны вызначылі яго мэтаімкнёнасць. Піваварная была калісьці «самым буйным прадпрыемствам», на якім працавала 60 рабочых. Магілеўцы пакажуць вам месца, дзе было таксама «значнае» прадпрыемства — кузня братоў Маз'я, на месцы якой выраслі цяпер цэхі вялікага машынабудаўнічага завода імя Дзімітрава; яны раскажуць вам, як на цішоўскім пустыры ўзнесліся ўгору вялікія карпусы шоўкавай фабрыкі імя Куйбышава, як збудаваліся трубаліцейны, аўтарамонтны завод, гарбарня і рад іншых. 13 тысяч рабочых працуе на прадпрыемствах савецкага Магілева. А ў 1912 годзе тут было 712 рабочых — не больш, чым і трыццаць год назад. «Стабільная», так сказаць была лічба. Стабільны паказчык адсталасці, тэхнічнай і індустрыйнай бездапаможнасці царскай Расіі. У 1913 годзе кошт усёй валавой прадукцыі Беларусі складаў 89 мільёнаў рублёў. Адзін савецкі Магілеў у 1937 годзе выпусціў прадукцыі на 185 мільёнаў 116 тысяч рублёў. Раніцай вуліцы горада запаўняе шумлівая дзятва — звыш 11 тысяч дзяцей навучаюцца ў магілеўскіх школах. Гэта — супроць 6500 вучняў 1912 года, калі ў гімназіях, прагімназіях вучыліся толькі дзеці заможных станаў ды чыноўнікаў і не з аднаго Магілева, а амаль што з усёй губерні. Губернскі Магілеў меў адзіную «вышэйшую» навучальную ўстанову—духоўную семінарыю. У савецкім Магілеве больш за 6 тысяч студэнтаў. У горадзе ёсць педагагічны інстытут, педагагічнае вучылішча, дашкольнае вучылішча, фельчарска-акушорскае вучылішча, педагагічны рабфак, музычныя школы і музычнае вучылішча, водны рабфак. Безліч спецыялістаў для нашай краіны рыхтуе Магілеў.

У вечаровыя часы зіхацяць агнямі шматлікія клубы, кіно, тэатр. Тут працоўныя Магілева асвойваюць багацці культуры. У вольны час дзятва шнуруе на дзіцячую тэхнічную станцыю, у Дом піянераў — былы губернатарскі дом і царскі палац, — будынак, які, нарэшце, атрымаў належнае скарыстанне.

Горад ганарыцца сваімі лепшымі людзьмі. Гэта — героі працы, героі сталінскіх пяцігодак, стаханаўцы, змагары за высокую прадукцыйнасць соцыялістычнай прамысловасці. Гэта — дзеці народа і яго абраннікі, дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР — работніца шоўкавай фабрыкі тав. Лісунова, старшыня горсовета тав. Іваноў. Магілеўцы ганарацца сваімі, вядомымі ўсёй краіне, гадаванцамі — загартаванай бальшавічкай тав. Разаліяй Землячкай, героем Совецкага Саюза акадэмікам О. Ю. Шмідтам.

Магілеўцы не забываюць пра шматвяковую гісторыю свайго горада, пра былы жахлівы прыгнёт і панаванне варожай шляхты, пра выбухі гневу народнага і барацьбу народа за сваю лепшую долю. Яны часта наведваюць свой гістарычны музей, у якім любоўна сабрана і экспаніравана шмат матэрыялаў з мінулага, у якім надзвычай удала і выразна адлюстравана наш сённяшні дзень — радасны і светлы. Параўноўваючы жахлівае мінулае са сваім жыццём, моладзь магілеўская вучыцца горача любіць сваю краіну, ненавідзець ворагаў яе, яна рыхтуецца бараніць радзіму ад памкненняў фашысцкай Польшчы, раз'юшанай шляхты.

„МАЯ МАЦІ“

(Пастаноўка Рагачоўскага калгаснага тэатра)

«Мая маці» — гэта ўжо трэцяя пастаноўка тэатра. І яна сведчыць, што малады тэатральны калектыў здольны працаваць над спектаклем сур'ёзна і ўдумліва.

П'еса мае шмат недахопаў. І асноўны з іх той, што аўтару не ўдалося ва ўсёй яркасці і пераканаўчасці стварыць тыповыя для нашай сучаснасці характары. Гэта паставіла ў вельмі цяжкое становішча актораў, выконваючых неакрэсленыя ролі. Яны пры ўсім сваім жаданні надаць сэнс гэтым персанажам, усё-ж не змаглі запоўніць недахопаў п'есы. А ператварэнне аднаго з гэтых герояў, Кудзінава, з лёгкай рукі рэжысёра ў дзяўчыну не выратавала становішча, а, наадварот, пагоршыла, бо ў спектаклі атрымалася два паралельных аднолькавых вобразы, якія яўна перашкаджаюць адзін другому. Артысткам-жа Магідзінай (Кацярына) і Алешка (Кудзінава) не ўдалося ў сваім выкананні знішчыць гэты паралелізм. Аднак, сваёй тэматычнай актуальнасцю, сваёй мэтаімкнёнасцю п'еса знаходзіць у гледача вельмі цёплы прыём, дае аудыторыі бадзёрую, натхняючую зарадку.

Сюжэт п'есы нескладаны. Сям'я савецкіх патрыётаў перажывае вялікую радасць—у доме паявіўся новы чалавек. Уся сям'я чакае з радзільнага дома шчаслівую маці са сваім першынцам. Але ў сям'і не хапае толькі бацькі навароджанага, ён на Далёкім Усходзе ахоўвае мірнае, радаснае жыццё краіны. І ўсё-ж усе адчуваюць яго ўдзел ва ўрачыстасці, яго блізкасць. Але вось, у самыя харошыя, прыемныя хвіліны ў дом прыходзіць няшчасце. Сям'я атрымоўвае вестку аб тым, што мужны пагранічнік у няроўным баю загінуў смерцю храбрых ад варожай кулі. Радасць змяняецца глыбокім смуткам. Сумуе не адна сям'я героя-пагранічніка, боль страты сціскае сэрцы працоўных усёй краіны. На месца героя ідуць новыя патрыёты, і сярод іх—самы малодшы брат загінуўшага байца. Сівая маці выпраўляе яго служыць краіне так, як служыў старэйшы брат. Мая маці — такое пачуццё павінна ўзнікнуць да гэтай простай, задушэўнай жанчыны ў кожнага савецкага гледача. У гэтым вобразе патрыёткі-маці заключаецца ўвесь асноўны сэнс п'есы. І ад таго, наколькі глыбока пранікне выканаўца ў гэтую ролю, будзе залежаць асноўны поспех спектакля.

Артыстка Дуброўская, выконваючы гэтую ролю, знайшла вельмі шмат трапных, тыповых рысаў для характарыстыкі Дабранавай. Толькі свайго рэалістычнага плана яна не вытрымоўвае ў неабходнай стройнасці, перагружаючы ігру пабочнымі сітуацыямі, расейваючы ўвагу на бытавыя дробязі, з натуралістычным прыстрасцем спыняючыся на дэталях.

Малодшы сын Дабранавай — Уладзімір—у выкананні артыста Гаробчанка застаецца ў памяці гледача жыццёрадасным комсамольцам, рашучым і мужным. Асноўныя штрыхі вобраза артыст перадае ярка і пераканаўча. І яго роля была-б яшчэ больш поўнакроўнай, калі-б ён здолеў пазбавіцца ў сваім выкананні дэкламацыйнасці і рытарычнасці ў маналогах, здолеў рознастайней перадаць паўнату думак і пачуццяў маладога патрыёта.

Скупымі, але вельмі пераканаўчымі мастацкімі сродкамі раскрывае артыст Свірчэўскі вобраз сакратара заводскага парткома. Імкнучыся даць жывы, рэалістычны вобраз, артыст надзяляе сваю ролю ўнутранай жыццёвасцю і чалавечнасцю.

Вельмі ўдумлівую работу над роллю Кічкасава прарабіў артыст Савіч. У п'есе гэты персанаж неакрэслены і нераспрацаваны. Выпадковымі рэплікамі другіх герояў аўтар характарызуе яго, як ворага, але не паказвае яго варожых учынкаў. І вельмі правільна зрабіў артыст, што ў аснову сваёй трактоўкі паклаў раскрыццё маральнага аблічча Кічкасава, выкрываючы яго нікчэмныя, нізкія страсці, яго дробязную душонку.

Ролю маладой маці, якая адзначае вялікую радасць у сваім жыцці — нараджэнне сына, артыстка Шкалярэнка крыху спрашчае, у сваёй ігры яна ідзе больш ад вонкавага, партрэтнага малюнка, не раскрываючы ўнутранай сутнасці вобраза. Але ў найбольш лірычных сцэнах у яе праскаўзваюць вельмі цёплыя і пераканаўчыя пачуцці, якія сведчаць аб яркіх артыстычных задатках.

Слабымі атрымаліся ў пастаноўцы ролі двух комсамольцаў у выкананні Галанцова і Бараноўскага. Гэта — маленькія, эпізадычныя ролі, і пры ўдумлівай іх распрацоўцы можна было-б дасягнуць пэўнага мастацкага эфекту.

Павярхоўна і несур'ёзна аднеслася да сваёй ролі артыстка Гурская. На яе ігры ляжыць пячаць любіцельшчыны, гэтакай лёгкай і непатрэбнай рысоўкі на сцэне. Замест пажылой удумлівай жанчыны — савецкай інтэлігенткі, паказанай у п'есе, Гурская іграе нейкую лёгкадумную мяшчанку. Праўда, у гэтай няўдачы вінаваты больш пастаноўшчык, які не дапамог выканаўцу пранікнуць у сутнасць вобраза, а цалкам даверыўся яе сілам, забываючыся, што кожная роля, кожны спектакль у маладым калектыве павінен спалучацца з карпатлівай творчай вучобай.

Гэтай вучобы ў Рагачоўскім калгасным тэатры пакуль няма, і калі ў далейшым яе не будзе, дык гэта можа выклікаць дрэнныя вынікі. Побач з гэтым мы адзначаем наяўнасць найшкаднейшых спроб фармалістычнага эксперыментатарства ў маладым тэатры. Рабалепнае прыкланенне перад мейерхольдаўшчынай, якое культывіруецца ў тэатры маладым рэжысёрам тав. Лізунковым, пагубна ўжо адбілася амаль на ўсіх яго пастаноўках. І нават у такой найбольш рэалістычнай пастаноўцы, як «Мая маці», рэжысёр не абыйшоўся без фармалістычных скажэнняў, праўда, не ў акторскім выкананні, а ў мастацкім афармленні спектакля.

У звычайным, аднапавярховым доме, дзе адбываецца дзея, па капрызу рэжысёра ўстаноўлена лесвіца. Гэты традыцыйны апрыкраўшы атрыбут фармалістаў абсалютна нічым не апраўдваецца ў спектаклі, да таго-ж выдае яўную непісьменнасць пастаноўшчыка ў элементарных архітэктурных уяўленнях. Таксама з відавочнай прэтэнзіяй на нечаканы эфект перад фінальнай сцэнай апускаецца чырвоная заслона. Гэта адцягвае ўвагу гледача, разбівае яго ўражанне.

Фармалістычныя скажэнні, найшкаднейшае штукарства неабходна адразу-ж спыніць з усёй рашучасцю і стварыць у маладым тэатральным калектыве сапраўдную творчую атмасферу, якая-б забяспечвала стварэнне поўнапэнных, рэалістычных спектакляў.

Ц. КРЫСЬКО.



Прэм'ера драмы «Барыс Гадуноў» у Ленінградскім Дзяржаўным тэатры юнага гледача. НА ЗДЫМКУ: сцэна з першага акта драмы. Саюзфота.

САМАДЗЕЙНЫЯ КАЛЕКТЫВЫ КЛУБА імя СТАЛІНА ДА 1 МАЯ

Самадзейныя калектывы менскага клуба імя Сталіна актыўна рыхтуюцца да першамайскіх святаў. Танцавальны калектыў рыхтуе беларускія народныя танцы — «Лявоніху», «Крыжачок» і «Бульбу» і украінскі танец «Гапак». З гэтым рэпертуарам танцавальны калектыў выступіць на першамайскім вечары і ў часе першамайскай дэманстрацыі.

Харавы калектыў рыхтуе рад новых песень: «Казацкую песню» з «Паднятай цаліны», «Песню аб папанінцах»—музыка Іванова, яўрэйскую народную песню «Сёння мы ўсе багаты», рускія песні «Ой, рэчанька, рэчанька», «Паходную», «Ад края і да края» з оперы «Ціхі Дон» і інш.

Беларускі драмгурток рыхтуе аднаактавыя п'есы «Пропуск» і «Пільнасць».

На працягу пяці дзён у клубе адбудуцца першамайскія вечары. Для дзяцей рабочых і работніц фабрык «Комунарка», хлебазавода, мясакамбіната і іншых прадпрыемстваў харчовай прамысловасці арганізуюцца ранішнікі. Дзецям будуць раздадзены першамайскія падарункі. На ўсе вечары запрашаюцца хатнія гаспадыні 8-га выбарчага ўчастка.

У часе першамайскага свята клуб пакажа кінофільмы — «Пакаленне пераможцаў», «Дэпутат Балтыкі» і «Апошняя ноч».

Бібліятэка клуба арганізуе выстаўку літаратуры на нацыянальных мовах, прысвечаную Першаму мая. З актыва чытачоў бібліятэкі вылучаны чытальнікі для чыткі мастацкай літаратуры ў цэхах фабрыкі «Комунарка» і на іншых прадпрыемствах. Для юных чытачоў бібліятэка арганізуе ранішнік.

Будынак клуба афармляецца на тэму: «Сталінская Канстытуцыя і надыходзячыя выбары ў Вярхоўны Совет БССР», а таксама на тэму аб вялікім пролетарскім святце Першае мая.

СВЯТОЧНЫ РЭПЕРТУАР КЛУБА ЗАВОДА імя ВАРАШЫЛАВА

Клуб заводаў імя Варашылава і імя Кірава шырока разгарнуў культурна-масавую работу. Пры клубе добра працуюць секцыі самадзейнасці, палітычна-масавая і юнацкая. Асабліва добра працуе секцыя самадзейнасці. Хор зараз налічвае 50 чалавек. Да 1 Мая хор падрыхтаваў «Песню аб Ежове», «Калінку», рускую народную песню «Ой, рэчанька, рэчанька», «Беларускую застольную» і інш. Хор карыстаецца вялікім поспехам у рабочых.

Клубны духавы аркестр налічвае больш 35 чалавек. Есць пры клубе і джаз, які да 1 Мая падрыхтаваў «Комсамольскую развітальную», «Тачанку», дзве казацкія песні, чырвонаармейскія частушкі і інш.

Балетны гурток, апрача беларускіх народных танцаў, рыхтуе «Калінку» і «Канавачку».

У клубным драмгуртку займаецца 38 чалавек. Гуртком кіруе тав. Уладзімірскі. Зараз гурток працуе над пастаноўкай п'есы «Слава» Гусева. Да святочных дзён гурток рыхтуе два скетчы—«Падруга» і «Пустая фармальнасць».

Палітыка-масавая секцыя клуба за апошні месяц наладзіла абмен самадзейнасцю з фабрыкай «Кастрычнік». Праведзен горкаўскі вечар. Зараз літаратурны гурток рыхтуе да 1 Мая свае ўласныя работы.

Пасля першамайскіх святаў пачынаем актыўна рыхтавацца да ўсесаюзнай алімпіяды мастацкіх калектываў варштатабудаўнічай прамысловасці.

Трэба адзначыць, што Дом народнай творчасці БССР нічым нам не дапамагае і ніякіх метадычных указанняў нам не дае.

Н. Ф. МЕЛЬНІКАЎ.

Культработнік камітэта ЛКСМБ завода імя Кірава.

Дырэкцыя, партгрупа, мясцком і ўвесь калектыў працаўнікоў Белдзярждрамтэатра выказваюць спачуванне заслужанаму артысту рэспублікі К. Ф. БЫЛІЧУ з прычыны трагічнай смерці яго БАЦЬКІ.

ПАРТЫЗАН ЖЭЛЕЗНЯК

Музыка С. Палонскага

Тэкст М. Галоднага



Шумяць пад Херсонам
Высокія травы,
Стаіць пад Херсонам курган,
Ляжыць пад курганам, зарослым бур'янам,
Матрос Жэлезняк, партызан.

Ён шоў на Одэсу,
Ён выйшаў к Херсону,
Папаўся ў засаду атрад:
Налева — застава,
Махноўцы — направа,
У хлопцаў-жа дзесяць гранат.

— Рэбята! — сказаў
Баявому атраду
Матрос, партызан Жэлезняк, —
— Херсон перад намі —
Праб'ёмся штыхамі,
І дзесяць гранат не пусцяк.

Сказалі рэбята:
— Праб'ёмся штыхамі,
І дзесяць гранат не пусцяк.
З штыхом і гранатай
Прайшлі стэп рэбята...
Астаўся матрос Жэлезняк.

Вясёлыя песні
Пяе Украіна
І юнасці славіць узлёт.
Сланечнік высокі
І ў небе далёка
Над стэпам плыве самалёт.

Шумяць пад Херсонам
Высокія травы,
Стаіць пад Херсонам курган,
Ляжыць пад курганам,
Зарослым бур'янам,
Матрос Жэлезняк, партызан.

Пераклалі М. Калачынскі, А. Астрэйка.

Г. Бярозкін

„МЯШЧАНЕ“

(Прэм'ера Дзяржаўнага віцебскага тэатра)

П'еса «Мяшчане» была напісана Максімам Горкім у 1902 годзе. Яна з'явілася першай, але ўпаўне спелай спробай сіл вялікага пісьменніка ў галіне драматургічнай творчасці. Спецыфічнасць «Мяшчан» заключаецца ў тым, што ўжо гэта першая п'еса Горкага мела ў сабе амаль усе асаблівасці драматургічнай манеры пісьменніка і ідэйна-грамадскай накіраванасці яго драматургіі. Гаворачы аб спектаклі Віцебскага тэатра, нам важна ўстанавіць, перш за ўсё, яго блізкасць да асноўнай своеасаблівасці горкаўскай п'есы, якая заключаецца ў тым, што тэатр імкнуўся раскрыць палітычны змест п'есы сродкамі і металамі горкаўскага тэатра.

Віцебскі тэатр паставіў «Мяшчан» па-горкаўску, гэта значыць, па-першае, што ён адышоў ад павярхоўнага захаплення эфектнымі сітуацыямі і што гэты адыход не выклікаў сабой натуралістычнага карыстання рэчамі і мёртвымі прадметамі, як ледзь не асноўнага спосабу перадаць «эмацыянальны падтэкст» горкаўскай п'есы.

Акторскі характар спектакля «Мяшчане» і вылучэнне на першы план актыўнай творчай індывідуальнасці маюць сваёй першачарговай прадпасылкай наяўнасць у п'есе «Мяшчане» у якасці асноўнай фарміруючай п'есу думкі—думкі аб працы, аб актыўным пераўтварэнні свету, аб «чалавечым імкненні да творчасці фактаў». Мы не памылімся, калі скажам, што імення гэта думка і адносіны да яе з'яўляюцца водараздзелам чалавечых характараў, фігурыруючых у «Мяшчанах».

«Мяшчане» з'явіліся першай п'есай, ды і наогул першым творам рускай літаратуры, у якім станоўчая ідэя належыць рабочаму-рэвалюцыянеру. За фігурай Ніла адчуваюцца мільённыя масы працоўнага і прыгнечанага народа, якія «настрайваюцца жыць». Прыгадаем, што п'еса «Мяшчане» была напісана напярэдадні першай рускай рэвалюцыі, калі рэвалюцыйны народ прадпрымаў адну з рашучых спроб змяніць лад жабрацтва і прыгнечання. Ніл—вобраз паўстаючага народа, фігура буравесніка. Іменна заклікальны і магутны крык буравесніка, а не жаласлівыя стогны чайкі чуваць у падтэксце горкаўскай п'есы. Прысутнасць Ніла ў п'есе Горкаму спатрэбілася і для таго, каб выкрыць у дробязнасці, у мяшчанскай сваекарыслівасці, у пошленькім індывідуалізме ўсіх гэтых мяшчанскіх дзяцей, практыкуючыхся ў грамадзянстве (Пётр і Тацяна Бессеменавы).

У Пятру Бессеменаву Горкі паказаў мяшчанскі індывідуалізм, які ставіць у цэнтры свету «здзіўляюча агіднае, напышлівае, жабрацкае «Я». Пётр — гэта тое-ж мяшчанства, якому гарачыя веянні часу нязначна падрумянілі шчокі. Актор Скальскі, які іграе Пятра, добра падкрэсліў унутраную сутнасць гэтага «мешчаніна, які быў грамадзянінам поўгадзіны». Пётр ахвотна гаворыць «радыкальныя» прамовы. Першае сваё паяўленне на сцэне Пётр суправаджае «выкрывальным» маналогам аб цесным і змрочным жыллі мяшчан, аб «дапатопных рэчах», якія «выцясняюць паветра, перашкаджаюць дыхаць». Пётр не мае нічога супроць, каб выкрыць скнарасць сваіх бацькоў. Ён гаворыць аб якойсці другой праўдзе, якая адрозніваецца ад вельмі вузкай і неўмяшчальнай бацькоўскай праўды. Якая гэта праўда? Тая-ж, скажам мы, праўда старога Бессеменава, уласніцкая, скнарная, эгаістычная. У гэтым сэнсе і стары Бессеменаў і сын яго—адзіны. Выходзячы з гэтага, тэатр і актор Скальскі і будавалі вобраз Пятра. У ім падкрэслена мяшчанскае нутро, з уласцівымі яму рысамі скнарнасці і дробнага разліку.

Але Пётр, пры ўсёй яго мяшчанскай істоце, не можа быць абсалютна прыроўнены да «узорнага мешчаніна»—старога Бессеменава. Прыраўніванне гэта негрунтоўна ўжо таму, што ў п'есе Горкага «Мяшчане» фігурыруюць усё-ж такі два вобразы: бацька Бессеменаў і сын Бессеменаў. Горкаму патрэбны былі абодва таму, што ў адным яму важна было падкрэсліць самую што ні на ёсць усталяўшуюся мяшчанскую сутнасць, карэнні гэтага саслоўя, самае ўвасабленне ўласніцтва, а другі патрэбен быў Горкаму затым, каб падкрэсліць ідэалагічную сутнасць мяшчанства, яго погляды і меркаванні па ўсіх пытаннях рускага грамадскага жыцця, якія наспелі к часу рэвалюцыі.

Тав. Скальскі іграе Пятра так, што ўжо з першага паяўлення Пятра на сцэне актор дыскрэдытыруе «антымяшчанскія» прамовы свайго героя злоснай і калючай недаверлівасцю. Адчуваецца, што актор робіць нейкія намаганні, каб падштурхнуць свайго героя па шляху яго класавага развіцця. Гэта і ёсць памылка актора. Яму нехапае другога погляду — погляду самога персанажа. Пятра трэба іграць, на хвілінку паверыўшы яму, тады фальшывасць і фактычнае двурушніцтва яго ўчынкаў выступяць яшчэ рэльефней. А то атрымоўваецца, што ўвесь ён, Пётр, з самага пачатку — як на далоні і перамога над ім не дае ніякага задавальнення.

Некалькі павярхова зразумеўшы ўстаноўку на выкрыццё, актор месцамі прымяніў сродак нават фарсавай ігры (апошняя сцэна).

Уласніцкая сістэма свету ў роўнай меры калечыць і Ніла і «вярхі», таму што яна стала варожай усяму чалавецтву. Гэта думка Горкага, да якой мы павінны прыйсці ў рэзультаце азнаямлення з вобразам Пятра, недастаткова ярка падкрэслена ў выкананні тав. Скальскага.

Між тым, гэта думка пацвярджаецца і ў цэлым радзе другіх персанажаў «Мяшчан», у прыватнасці, у вобразе Тацяны Бессеменавай (акт. Бандарчык).

У Тацяне Бессеменавай Горкі развянчаў адвечных сваіх ворагаў — людзей, што «спецыялізіраваліся» на пакутах. Ён іх ненавідзеў, таму што бачыў сэнс сваёй грамадскай дзейнасці ў сцвярджэнні дзейсных адносін да жыцця, а яны — гэтыя «пакутнікі» — перашкаджалі яму.

Тацяна аслеплена пакутамі. Яна не верыць у будучае і з якімсьці патаемным сладастрасцем выкрывае людзей у «змане», калі тыя імкнуцца паверыць у другое жыццё, большае і цікавейшае. Актрыса Бандарчык удала падкрэсліла ўсе гэтыя рысы таго-ж мяшчанскага эгаізма ў вобразе Тацяны. У значна большай меры, чым тав. Скальскаму, актрысе ўдалося адлюстраваць у сваім вобразе і рысы афяры буржуазнага ўласніцкага свету. Пры ўсёй адмоўнасці вобраза актрыса ўтрымала ўсё-ж рысы сапраўднай чалавечнасці пры паказе цяжкіх пакут Тацяны.

Тацяна кахае Ніла, чалавека, які ва ўсіх сваіх жыццёвых імкненнях супроцьлеглы і чужы ёй. Але яна ў сваім каханні права. Над ёй нельга зубаскаліць. Гэта своеасаблівая трагедыя, але такая трагедыя, калі глядач не можа суб'ектыўна спачуваць да апошняй рысы характару, а толькі ўзнімаецца да разумення жыццёвых прычын, якія выклікалі пакуты, гора, трагедыю.

Актрысе Бандарчык можна паставіць у дакор некаторую манатоннасць, некаторае залішняе захапленне паталагічным, а не мысліцельным момантам. Амаль тое-ж самае можна паставіць у віну актору Вялікаму (пеўчы Цецераў), які галоўную сваю ўвагу звярнуў на паказ паталагічнага становішча алкаголіка замест выдзялення войстрай, здзеклівай думкі анархіствуючага чалавека.

Цецераў, — прамы наследнік «басяцкіх» персанажаў Горкага, — у «Мяшчанах» саступіў сваё цэнтральнае месца новаму персанажу — Нілу. Аднак, і тут яго роля значная. «Жыццё сапсавана! Яно — дрэнна сшыта... Не па росту прыстойных людзей зроблена жыццё, гавару я. Мяшчане звузілі яго, укарацілі яго, зрабілі цесным... і вось я ёсць рэчавы доказ таго, што чалавеку няма дзе, няма чаго, няма патрэбы жыць...». Гэта гаворыць Цецераў. Ён ненавідзіць мяшчанскае жыццё, але ён не ў сілах яго змяніць. Таму ён з глухой зайздрасцю наглядае за Нілам.

Роля Цецерава заключаецца ў тым, што ён здзекуецца з Бессеменавых, таму што ён разумней і лепш за Бессеменавых. Ён «нігіліст». Калі Пётр гаворыць свой маналог аб «драмах, якія крамсаюць душу чалавека, што стаіць паміж «хачу» і «павінен», Цецераў акампаніруе яму няскладным брынчаннем на раялі і ў яго ў гэтым месцы па рэмарцы Горкага ўхмылка на твары. У Цецерава—Вялікага твар панурыя, перакошаны злосцю. І так у большасці месц, калі Цецераў здзекуецца з Бессеменавых. Гэта сур'ёзная памылка.

Добры ў спектаклі стары Бессеменаў (засл. арт. рэсп. Ільінскі). Кожная новая работа Ільінскага — новы этап у пашырэнні амплуа, новае набыццё, новая сустрэча з новым чалавекам, цікавая і знамянальная. Стары Бессеменаў па-сапраўднаму выразны, але ў ім адчуваецца некаторая аднастайнасць. Яна адсутнічала-б толькі ў тым выпадку, калі аўтары спектакля звярнулі-б галоўную ўвагу не на паказ прыроджана - станоўчых ці прыроджана - адмоўных якасцей, уласцівых героям, а на больш агульныя законы ўласніцкага мяшчанскага быцця. І стары Бессеменаў па-свойму правы, скажам, у жаданні адстаяць сям'ю. Аб ім нават гавораць пасля аднаго «канфлікта» з дзецьмі: «што вы пакрыўдзілі бацьку?» Аб Бессеменаве — Ільінскім гэтага не скажаш, а хутчэй: «што вы разгневалі бацьку», ці што-небудзь у гэтым сэнсе... Тыранства Бессеменава нельга тлумачыць яго асабістымі якасцямі, а перш за ўсё перавагай грубага драпежніцкага пачатку, якім прасякнуты Бессеменаў. Не асабістая злосць, а агульная антычалавечая ідэя ўласнасці, якая калечыць людзей. Толькі ў такім выпадку адпала-б неабходнасць у вонкавых прыёмах, якімі часам карыстаецца актор для падкрэслівання «зладзейскай» істоты Бессеменава (сагнутая спіна, асаблівая хада, крык).

Варта асобна выдзеліць групу вобразаў людзей, якія супроцьстаўлены мяшчанскаму свету (Ніл, Поля, Перчыхін). Аб іх сказана, што яны «настрайваюцца жыць» і таму варожы ў адносінах да Бессеменавых.

Аб Ніле мы ўжо гаварылі. Скажам, што актор Шэлег у ролі Ніла дасягнуў вялікай сцэнічнай прастаты ў перадачы будзённага і намерана не перапавялічанага гераізма пролетарыя-машыніста. Уступленне ў жыццё — сцэнічны лейтматыў вобраза Ніла. І актор Шэлег па-сапраўднаму добра яго выразіў, хоць і не ўсюды вызваліўся ад налёту рэзанёрства.

Вялікай перамогай маладой актрысы Гарэлавай трэба лічыць яе выкананне ролі Полі — простай, здаровай дзяўчыны, якая ўмее бясхітрасна і проста глядзець на жыццё. У ёй багата цеплыні і абаяння. Хацелася-б толькі, каб актрыса ўмела дасягнутае авалоданне вобразам узняць на больш высокую ступень сцэнічнага гучання.

Цікавы вобраз птушніка Перчыхіна—дзівака, які ацураўся ад штодзённага мяшчанскага жыцця, жыве «птушынымі парадкамі»,—стварыў таленавіты актор Малчанаў. Дваістасць, якая відаць у гэтым вобразе, мае сваімі рэальнымі карэннямі сапраўдную дваістасць горкаўскай ацэнкі яго. З аднаго боку, прысутнасць паэзіі, непасрэднае ўспрыняцце жыцця, чалавечы дух, а з другога боку — непрыемлемая для Горкага рыса пасівізма, усёдаравання, адмаўленне ад эгаістычных разлікаў, як адзіная праява пратэсту.

Недапрацаваным да канца аказаўся вобраз Елены Краўцовай (актр. Кашэльнікава). Па замыслу Горкага гэта здаровая і добрая душа, якая таксама належыць да тых людзей, якія «настрайваюцца жыць». Не дзіва, што тая сцэна, у якой Елена з ціхім сумам успамінае аб «бедных арыштантах», з якімі яна некалі забаўлялася, як з дзецьмі, у якойсці меры пераклікаецца з самымі паэтычнымі старонкамі Горкага, з паэмай «26 і адна». У Елены—Кашэльнікавай вельмі мала ціхага суму і вельмі мала паэзіі. Няўтрымная весялосць — яе сутнасць, што і робіць гэты вобраз аднабокім. Месцамі Елена гэткая дурненькая і так адштурхоўвае ад сябе, што нават абражае сваёй блізкасцю да Полі, не кажучы ўжо аб Ніле. Месцамі яна проста пошлая жанчына-драпежніца, грубаватая і неразумная. Усё гэта ад недастатковай прадуманасці вобраза.

У асноўным, трэба лічыць «Мяшчане» (пастаноўка рэжысераў Віньяра і Тамарына) добрым горкаўскім спектаклем. Наяўныя-ж недахопы тэатр павінен будзе выправіць.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-364. Уп. Галоўліт-бела К—5501